С. Адзінцоў, С. Сідор

ЗАЙМАЛЬНАЯ ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ



С. Адзінцоў, С. Сідор

ЗАЙМАЛЬНАЯ ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ

Мінск
«Народная асвета»
1995

ББК 26.8(4Беи)
А 29
УДК 914.76 + 882.6-1

Адзінцоў С., Сідор С.

А 29 Займальная геаграфія Беларусі.— Мн.: Нар. асвета, 1995.— 80 с.

ISBN 985-03-0222-4

У кнізе змешчаны складзеныя ў займальнай форме заданні — віктарыны, чайнворды, крыжаванкі і інш., а таксама вершы пра Беларусь.

Прызначаны для выкарыстання ў якасці дапаможніка пры вывучэнні геаграфіі Беларусі, будзе карысны для ўсіх, хто цікавіцца геаграфіяй Бацькаўшчыны.

А 9140760000—059 / М303(03) — 95 —95 **ББК 26.8(4Беи) + 65.9(4Беи) + 84(4Беи)-5**

ISBN 985-03-0222-4

© С Адзінцоў С Сідор 1995

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Кніга, якую вы разгарнулі, прысвечана роднай Беларусі, яе прыродзе, азёрам і рэкам, лясам, запаведным мясцінам, яе гарадам і вёскам. У кнізе вы знойдзеце вершы, напісаныя ў розныя часы рознымі паэтамі, і старонкі займальнай геаграфіі — віктарыны, чайнворды, крыжаванкі, цікавыя звесткі і заданні. Усё — пра геаграфію нашай Бацькаўшчыны.

Выдатны беларускі географ і грамадскі дзеяч Аркадзь Смоліч ва ўступе да сваёй «Геаграфіі Беларусі», выдадзенай у 1923 г., пісаў: «...З паняццем Бацькаўшчына ў нас зьвязуецца яшчэ і нейкае цёплае, а іншы раз вельмі гарачае пачуцьцё да нашае роднае стараны. Кожны чалавек любіць сваю Бацькаўшчыну, незалежна ад велічы і хараства яе прыроды, ад яе багацьця і славы, ад таго дабрабыту, якім яна дарыць сваіх сыноў... А гэткае замілаваньне змушае нас цікавіцца роднаю стараною, яе рэкамі, гарамі, лясамі, месцамі, як цікавяцца кожным прадметам, якога любяць.

...З гэтага мы бачым, як чалавеку патрэбна навука геаграфія Бацькаўшчыны».

Хочацца спадзявацца, што наша кніга будзе карыснай не толькі для настаўнікаў, вучняў і студэнтаў, але і для ўсіх, хто цікавіцца геаграфіяй Беларусі і хоча праверыць або пашырыць свае веды.



Гэта ты, мая Беларусь

Пятрусь Броўка

Беларусь

(Урывак)

Зямля Беларусі! Бары і дубровы,
Жытнёвае поле, шаўковы мурог,
У промнях рабіны заход вечаровы,
Што клёкат буслоў — ручаёў перамовы
І ў шумных прысадах істужкі дарог.

Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс,
Начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпаных кроплямі рос.

Былога быліны, старога паданні
Плывуць, як аблітыя сонцам чаўны,
Па краю зялёным, прасторах бяскрайніх
Ад Нёмна да Сожа, ад Буга да Гайны,
Па хвалях Дняпра і шырокай Дзвіны.

Алесь Бачыла

Цябе мы назвалі Радзімай

Дзе рэчкай, дзе борам, дзе лугам
Ты вабіш сабою здаля,
Зямля між Дняпром і між Бугам,
Спрадвечная наша зямля.

Цябе мы назвалі Радзімай
Не годам раней, не двума,
Не годам-двума прынялі мы
Тваё дарагое імя.

З тых дзён і па сёння прадвеснем
Па нівах і ціхіх гаях
Гучаць: твая звонкая песня,
Пявучая мова твая.

І нам нездарма аддавалі,
Як скарб запаветны зямлі,
Каб мы — праз вякі шанавалі,
Каб мы — праз вякі бераглі.

Калі ж гэты скарб чужаніца
Панішчыць захоча ў агні,
Каму ж, як не нам, заступіцца,
Каму ж, як не нам, бараніць!

Табе прысягалі ў жыцці мы,
За вернасць пад кулі ішлі,
Мы самі цябе як Радзіму
У сэрцы свае прынялі.

Янка Золак

Мая Беларусь

Беларусь для мяне — мая родная маці,
што ў залочаны восені цвет
у сялянскай з лучынаю хаце
нарадзіла мяне на свет.

Беларусь для мяне — гэта шчырая вера,
гэта сэрца сыноўняга стук.
Беларусь для мяне — гэта звонкая лера
і цымбалаў раскацісты гук.

Беларусь для мяне — гэта белыя зімы
і вясновы бурлівы разліў;
васількі ў жытох гаманлівых,
водар бэраў, антонавак, сліў.

Беларусь для мяне — гэта восень з кастрыцай,
верацёнаў гудзенне, красён перастук;
кужаль, вытканы мамай, сястрыцай,
гэта плёны ад працы мазолістых рук.

Беларусь для мяне — гэта слуцкія ткаллі,
што прыгожыя ткуць паясы;
гэта рэк і азёраў срабрыстыя хвалі,
Белавежская пушча і Пінска лясы.

Беларусь для мяне — гэта нафта Палесся
і капальні калійнае солі;
гэта спевы птушыныя ў лесе
і палеткаў шырокіх прыволле.

Беларусь для мяне — Каліноўскі, Скарына,
Багушэвіч, Купала і сотні такіх,
каго гора-бяда не скарыла,
хто ніколі не зрокся сваіх.

Беларусь для мяне — гэта спеўная лера
і крынічка, што з лесу бяжыць;
у свой край непахісная вера,
што ён жыў, і жыве, й будзе жыць.

Уладзімір Скарынкін

Беларусі

Белая Русь мая!
Чыстая ты мая!
Родная ты мая!

Белыя гоні бульбы,
Белыя косы дзяўчат.
Воблакаў белых над Бугам
Вечны парад.

Белых грыбоў кашолкі,
Белыя плечы бяроз,

Белыя россыпы золкіх
Чыстых світальных рос.

Белых туманаў плыні,
Белыя вершы буслоў.
Ціхая завадзь Бялыніч,
Рык белавежскіх зуброў.

Вейкі рамонкаў белых,
Белыя грывы завей.
Чыстыя душы смелых,
Простых тваіх людзей.

Не засмуцілі войны
Позірк лагодны твой.
Толькі бялеюць скроні
Ўдовінай сівізной.

Белая Русь мая!
Чыстая ты мая!
Родная ты мая!

Невялікае падарожжа па запаведных кутках Беларусі

Белавежская пушча

Белавежская пушча — адзін з самых старажытных лясных масіваў Еўропы. Размешчаны ён на паўднёвым захадзе Беларусі, уздоўж мяжы з Польшчай, на водападзеле басейнаў Заходняга Буга, Нёмана і Прыпяці, у 60 км ад Брэста. У межах Беларусі Белавежская пушча займае плошчу каля 145 тыс. га. Назву сваю пушча атрымала, магчыма, ад абарончай вежы са сценамі белага колеру, пабудаванай у XIII стагоддзі (Белая Вежа ў Камянцы). На працягу стагоддзяў пушча з'яўлялася месцам княжацкага і каралеўскага палявання. З сярэдзіны XVII стагоддзя Белавежская пушча — адзінае месца ў Еўропе, дзе вадзіліся зубры. Пасля першай сусветнай вайны зуброў у пушчы не засталося зусім. У 1929—1930 гг. у Германіі і Швецыі было закуплена 7 зуброў для Белавежскай пушчы. У 1939 г. пушча аб'яўлена запаведнікам, у 1957 г.— запаведна-паляўнічай гаспадаркай. Цяпер у пушчы звыш 180 зуброў.

Калі апынаешся ў белавежскім лесе, здзіўляешся яго некранутай прыгажосці. Тут узвышаюцца векавыя дубы і сосны, разгалістыя грабы, стройныя клёны і вязы. У змроку блукаюць ласі, дзікі, касулі...

У флоры пушчы налічваецца каля 850 вышэйшых раслін. Растуць тут і рэдкія расліны. Сярод іх арніка горная, цыбуля мядзведжая, чына гладкая, купальніца еўрапейская і інш. У фауне, тыповай для лясоў Усходняй Еўропы, 59 відаў млекакормячых, каля 230 відаў птушак, 11 відаў земнаводных, каля 30 відаў рыб. Складзены спіс рэдкіх раслін і жывёл, якія ахоўваюцца і занесены ў Чырвоную кнігу.

У 1991 г. Белавежскай пушчы нададзены статус нацыянальнага парку.

Блакітныя азёры

На паўночным захадзе Беларусі, дзе сходзяцца межы трох абласцей — Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай, размешчана Балдуцкая група азёр. Невялікія па плошчы, але глыбокія, азёры паражаюць сваім харастом. Злучаныя паміж сабою ручаямі, яны здаюцца казачнымі. У 1972 г. дзеля аховы гэтага дзіўнага прыроднага комплексу быў створаны ландшафтны заказнік «Блакітныя азёры».

Хваёвыя лясы займаюць каля 90 % тэрыторыі заказніка. Растуць тут больш за 500 відаў вышэйшых раслін, сярод якіх шмат ахоўных (венерын чаравічак, баранец звычайны). Толькі тут у межах Беларусі сустракаецца мечтрава звычайная. Расце яна ў прыбярэжнай паласе на глыбіні да 0,5 м. Пустыя, амаль цыліндрычныя сцяблы гэтай расліны дасягаюць да 1,5 м. Меч-трава расце толькі ў двух невялікіх азёрах — Глубенька і Ячмянец.

Чыстая вада, маляўнічыя берагі азёр, лясістыя ўзгоркі штогод прывабліваюць да сябе сотні турыстаў.

Браслаўскія азёры

На захадзе Віцебскай вобласці, ля самай мяжы з Латвіяй, у маляўнічай узгорыстай мясцовасці размешчана вялікая група азёр пад агульнай назвай — Браслаўскія азёры. Каля 30 азёр займаюць плошчу звыш 110 км^2. Самыя вялікія сярод іх азёры Дрывяты і Снуды. Азёры злучаны паміж сабой рэкамі, ручаямі і пратокамі.

На беразе возера Дрывяты стаіць адзін са старажыт-

ных беларускіх гарадоў — Браслаў. Яму больш за 900 гадоў. Каля возера знаходзіцца турысцкая база «Браслаўскія азёры». Пракладзены цікавы водна-турысцкі маршрут.

Бярэзінскі біясферны запаведнік

Запаведнік размешчаны ў межах Барысаўскага раёна Мінскай, Докшыцкага і Лепельскага раёнаў Віцебскай вобласці. Ён займае плошчу 76 тыс. га. Праект запаведніка быў распрацаваны А. У. Фядзюшыным, які ў 1920-х гг. выявіў у вярхоўях Бярэзіны пасяленні баброў. Да таго часу лічылася, што бабры зусім зніклі з тэрыторыі Усходне-Еўрапейскай раўніны. Бярэзінскі запаведнік арганізаваны ў 1926 г. У 1978 г. яму нададзены статус біясфернага запаведніка.

Раўнінную тэрыторыю запаведніка з поўначы на поўдзень перасякае рака Бярэзіна. Апрача яе, у межах запаведніка больш за 50 невялікіх рэк і ручаёў, перагароджаных бабровымі плацінамі. Налічваецца не менш як 200 паселішчаў баброў.

Лес займае 83 % запаведнай тэрыторыі, астатняя плошча занята балотамі, лугамі, азёрамі і рэкамі. Галоўныя лесаўтвараючыя пароды — сасна, бяроза, елка, чорная вольха. У падлеску растуць ляшчына, рабіна, крушына, маліна, чаромха. У запаведніку знайшлі свой прытулак воўк, дзік, ліс, янотападобны сабака, барсук, выдра, куніца. Можна сустрэць бурага мядзведзя, высакароднага аленя, касулю. Гняздуюцца чорны бусел і шэры журавель, з рэдкіх драпежных птушак — арол-беркут, малы падворлік, філін, скапа.

У Бярэзінскім запаведніку вядуцца разнастайныя назіранні і даследаванні па праграме біясферных запаведнікаў міжнароднага значэння.

Вялікі камень

На палях паўночнай і цэнтральнай часткі Беларусі часта сустракаюцца акруглыя згладжаныя камяні. Гэта валуны — след ледавіковай дзейнасці ў мінулыя геалагічныя эпохі. У старажытнасці з валуноў будаваліся замкі, абарончыя вежы. Цяпер валуны выкарыстоўваюцца для вырабу друзу, для стварэння архітэктурных кампазіцый.

Памеры валуноў іншы раз дасягаюць некалькіх метраў. Буйныя валуны аб'яўлены геалагічнымі помнікамі прыроды і з'яўляюцца запаведнымі. Яны маюць свае назвы: Камень

Багушэвіча, Камень філарэтаў, Камень-волат. Самы буйны валун знаходзіцца на Віцебшчыне, на ўскраіне невялікай вёскі Горкі Шумілінскага раёна. Гэта — Вялікі камень. Даўжыня яго 11 м, шырыня — 5,6 м, вышыня — 2,8 м. Вялікі камень мае цёмна-карычневы колер і прасавідную форму.

Возера Сялява

На самай поўначы Крупскага раёна Мінскай вобласці ёсць возера з дзіўнай назвай Сялява. Гэта сапраўды цудоўны куток беларускай прыроды. Плошча возера ўсяго 15 км^2. Шырокай пратокай яно злучана з другім возерам — Абіда. Нізкія пясчаныя берагі Сялявы зліваюцца са схіламі.

Возера багата рыбай. Водзяцца ў ім плоткі, акуні, ляшчы, шчупакі, ліні. А колькі тут вадаплаўных птушак! Чайкі, чаплі, чыркі, качкі... У прыбярэжных лясах з'явіўся чорны бусел. На жаль, знікае шыракапальцы рак, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Для падтрымання воднага рэжыму возера ў 1981 г. арганізаваны гідралагічны заказнік «Прошыцкія балоты».

Святая гара

За 30 км на паўднёвы захад ад Мінска, за 20 км на поўнач ад Дзяржынска, ля вёскі Скірмантава знаходзіцца вышэйшы пункт Мінскага ўзвышша і ўсёй Беларусі. Ён мае вышыню 345 м над узроўнем мора. Спрадвеку гару гэтую называлі Святой, толькі з 1958 г. яе сталі называць гара Дзяржынская.

І не скажаш, што гэта вышэйшая кропка нашай краіны, да і гарой яе не назавеш. Антрапагенавыя адклады згладзілі вяршыню гары, яна набыла від буйнога спадзіставыпуклага падняцця. Схілы гары ўзараныя, толькі на поўначы і паўночным захадзе пакрыты маладым лесам. Ля падэшвы Святой гары размешчаны вытокі Волмы, Усы, Пцічы. Над імі гара ўздымаецца на 40—50 м.

«Брат і сястра»

Ля дарогі з пасёлка Гарадзеі ў горад Нясвіж многім даводзілася бачыць цікавы прыродны аб'ект. Два дрэвы — звычайныя дуб і сасна — растуць быццам бы з аднаго кораня. Дрэвам ужо амаль 100 гадоў. Вышыня дуба — 21 м, сасны — 23 м. Згодна народнаму паданню дуб і сасна

растуць на месцы пахавання закаханых, разлучаных злым князем. «Брат і сястра» — такую назву атрымаў гэты помнік прыроды.

Ганалес

У 1956 г. за 10 км на паўночны захад ад Мінска, на паўднёва-ўсходніх схілах Мінскага ўзвышша, было створана вялікае вадасховішча. Плошча яго склала каля 30 км^2, сярэдняя глыбіня — 3,8 м. Вадасховішча сталі называць Ганалес. Такую назву насілі вёска і балота, на месцы якога ўзнікла вадасховішча. Крыху пазней вадасховішча перайменавалі ў Заслаўскае.

Спадзістыя схілы, спрыяльныя мікракліматычныя ўмовы, маляўнічыя лясныя масівы, пясчаныя берагі сталі адным з самых любімых месцаў адпачынку мінчан. Яны назвалі вадасховішча Мінскім морам. Гэтая назва паступова стала выцясняць дзве папярэднія. Відаць, далёка не кожны мінчанін сёння ведае, што такое Ганалес.

На беразе вадасховішча размясціліся міжнародны маладзёжны цэнтр «Юнацтва», санаторыі, спартыўныя базы. Багатае рыбай, яно прыцягвае да сябе ўлетку і зімой сотні рыбакоў.

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка»

Мемарыяльны запаведнік арганізаваны ў 1972 г. Ён уключае вёску Вязынку Маладзечанскага раёна і яе навакольныя мясціны па берагах ракі Вязынкі. Цэнтральнае месца ў ім займае сядзіба з хатай, у якой нарадзіўся народны паэт Беларусі Янка Купала. Яблыневы сад, штучны вадаём, насаджэнні ліпы, бярозы, елкі, бэзу. Побач з хатай устаноўлены помнік паэту. У хаце — філіял літаратурнага музея Янкі Купалы.

На вялікім валуне, што каля хаты, выбіты словы паэта: «Тут бачу свой край, поле, рэчку і бор, сваю матку — зямлю Беларусь».

Вакол помніка Я. Купалу 60 кустоў руж: столькі год пражыў пясняр.

У 1982 г. у гонар 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы на тэрыторыі запаведніка пасаджана 100 маладых дубоў.

Кожны год тут праводзяцца святы паэзіі, праходзяць злёты студэнтаў-філолагаў. І гучаць словы паэта.

Коласаўскі мемарыяльны заказнік

Мемарыяльны заказнік арганізаваны ў 1972 г. для захавання месцаў, звязаных з жыццём і творчасцю народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Ён знаходзіцца ля вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна, размешчанай на беразе Нёмана, у 12 км ад Стоўбцаў. Заказнік уключае маляўнічыя навакольныя дубровы, сасновыя лясы, лугі.

Захавалася хата, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта, хата і гаспадарчыя пабудовы на сядзібе, дзе жыў паэт у 1890—1902 гг. Тут размешчаны філіял літаратурнага музея Якуба Коласа. «Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы»,— пісаў паэт аб сваіх родных мясцінах.

Налібоцкая пушча

У цэнтральнай частцы Беларусі, на захад ад Мінска, у басейне правых прытокаў Нёмана Бярэзіны з Іслаччу і Усы, раскінуўся буйны лясны масіў. Гэта Налібоцкая пушча. Яна займае больш за 60 тыс. га. Тут пераважаюць сасновыя лясы, растуць таксама алешнікі і беразнякі. Цераз Налібоцкую пушчу праходзіць паўночная мяжа суцэльнага распаўсюджання грабу. У поймах рэк дамінуюць асаковыя лугі. Значная частка пушчы забалочана.

Сярод насельнікаў пушчы ласі, казулі, дзікі, бабры. Можна сустрэць бурага мядзведзя, барсука, рысь. Пушча багата баравой дзічынай. Сустракаюцца рэдкія для Беларусі віды травяністых раслін. У паўднёвай частцы пушчы знаходзіцца маляўнічае возера Кромань.

У 1940—1951 гг. Налібоцкая пушча мела статус дзяржаўнага запаведніка (Вялаўскі запаведнік). Ён быў арганізаваны для аховы і аднаўлення каштоўных капытных жывёл і рачных баброў. З 1960 г. пушча з'яўляецца паляўнічым заказнікам.

Прыпяцкі запаведнік

Беларускае Палессе — моцна забалочаная нізіна, частка вялікага прыроднага рэгіёна. Палессе называюць галоўным балотам Еўропы. Якуб Колас называў гэты прыродны куток «зачараваным краем». Ён пісаў: «Цяжка адарваць вока, калі неабсяжныя прасторы Палесся, залітыя праменямі веснавога сонца, аблытаныя бэзавай дымкай, поўныя зача-

равання, паўстаюць перад вашым поглядам». Але гэта было напісана больш чым паўстагоддзя назад. Памылкі ў правядзенні меліярацыі прывялі да таго, што на значнай частцы Палесся панізіўся ўзровень падземных вод, зніклі многія малыя рачулкі, звычайнымі сталі тарфяныя буры, адбыліся змены ў раслінным і жывёльным свеце.

У 1969 г. для захавання унікальных краявідаў Беларускага Палесся і вывучэння змяненняў у прыродным комплексе ў сувязі з меліярацыяй быў заснаваны Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік. Ён размешчаны на захадзе Гомельскай вобласці ў міжрэччы Прыпяці, Убарці і Сцвігі. Займае плошчу ў 63 тыс. га.

На тэрыторыі запаведніка балоты, лугі, сасновыя і драбналістыя лясы, дубровы. Сустракаюцца рэдкія рэліктавыя расліны. Сярод насельнікаў запаведніка — лось, казуля, лясная куніца, рысь, янотападобны сабака, выдра, бобр, андатра, янот-паласкун. Шмат вадаплаўных, балотных і лугавых птушак. Водзяцца балотная чарапаха, бязногая яшчарка, земнаводныя.

Вусце Лані

На левабярэжжы Прыпяці пры ўпадзенні ў яе ракі Лань быў арганізаваны біялагічны заказнік «Вусце Лані». У гэтым месцы перасякаюцца міграцыйныя шляхі шматлікіх відаў птушак. У вусці Лані знаходзіцца адна з буйнейшых у Еўропе калоній шэрых чапляў. Усяго ж у заказніку каля 60 відаў птушак. Сярод іх сапсан, пустальга, чарацянкі, пугач, зімародак і інш. Адзначана балотная чарапаха. Ёсць і рэдкія віды раслін (малачай глянцавы, дуброўнік часночны).

Максім Рыльскі

Беларусь

Ляжаць упартыя на полі валуны
На Маладзеччыне, у азёрным краі;
Мой спадарожнік, безумоўна, знае:
Ледавіком пакінуты яны.

Ды Беларусі ўпартыя сыны
Сказалі: неадольных не бывае —
І камень перад плугам адступае,
Як снег перад атакаю вясны.

Як добра бачыць позіркам уласным,
Што йдзе вясна народу ў промнях ясных,
Што на палях, дзе мужны лёг Кастусь,

Пшаніцай спелай, сінякветным лёнам,
Заводаў несціханым перазвонам
Жыве і маладзее Беларусь!

Пятрусь Броўка

Родныя словы

Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест.
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск,
Пінск,
Брэст.

Калі паразважыш, няцяжка дазнацца,
Бо сведчаць на ўсю неабсяжную шыр,
Што продкі любілі спакойную працу,—
Шклоў,
Клецк,
Мір.

А вораг находзіў,— бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі —
Пціч,
Друць,
Сож.

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была, як агонь.
У сёлаў імёны, як гукі цымбалаў,—
Блонь,
Струнь,
Звонь!

«Віктарына «Падарожжа па карце Беларусі»

1. Якія гарадскія паселішчы знаходзяцца на 26-м мерыдыяне ці паблізу яго?

2. Якія раённыя цэнтры знаходзяцца на 30-м мерыдыяне ці паблізу яго?

3. Назавіце самы заходні раён Віцебскай вобласці.

4. Назавіце самы паўночны раён Гродзенскай вобласці.

5. Назавіце самы ўсходні горад Гомельскай вобласці.

6. Назавіце рэкі, па якіх на пэўным працягу праходзіць мяжа з дзяржавамі-суседзямі.

7. Якая рака некалькі разоў перасякае дзяржаўную мяжу Беларусі?

8. Які абласны цэнтр размешчаны бліжэй за астатнія да сталіцы?

9. У межах якой вобласці знаходзіцца Мірскі замак?

10. Праз якія гарады трэба праехаць, каб трапіць з Мінска: а) у Маладзечна; б) у Барысаў; в) у Салігорск?

11. Якія раённыя цэнтры размешчаны на Прыпяці?

12. Назавіце самы паўночны раён Брэсцкай вобласці.

13. Па тэрыторыі якіх раёнаў Мінскай вобласці не праходзяць чыгункі?

Віктарына «Выберы правільны адказ»

Выберыце правільны адказ з ліку тых, што прыведзены ў дужках.

1. Колькасць насельніцтва Беларусі складае (менш за 10 млн чалавек, больш за 10 млн, 10 млн чалавек).

2. На тэрыторыі нашай краіны здабываюць (прыродны газ, граніт, жалезную руду, баксіты).

3. На Беларусі на ўзвышшы прыпадае прыкладна (1/2, 1/4, 1/5, 1/3) частка ўсёй плошчы.

4. Гара Лысая знаходзіцца на (Мінскім, Навагрудскім, Віцебскім, Ваўкавыскім) узвышшы.

5. Самы вялікі па плошчы рачны басейн (Нёмана, Дняпра, Заходняй Дзвіны, Заходняга Буга).

6. Плошча Брэсцкай вобласці — (25 тыс. км^2, 40,4 тыс. км^2, 29 тыс. км , 32,3 тыс. км^2).

7. (Нараў, Проня, Ясельда, Сож) — гэта левы прыток Прыпяці.

8. Агульная даўжыня Нёмана (498 км, 937 км, 1020 км, 220 км).

9. На другім месцы па плошчы сярод азёр Беларусі знаходзіцца возера (Асвейскае, Лукомскае, Дрысвяты, Нарач).

10. У міжрэччы Нёмана і Шчары знаходзіцца (Налібоцкая, Гродзенская, Ліпічанская, Белавежская) пушча.

11. Найбольш урадлівыя ва ўмовах Беларусі (тарфяна-балотныя, поймавыя, дзярнова-падзолістыя, дзярнова-карбанатныя) глебы.

12. Каля паловы ўсёй пасяўной плошчы краіны адводзіцца пад (кармавыя, збожжавыя, тэхнічныя) культуры.

13. Першы беларускі аўтамабіль быў выпушчаны на аўтамабільным заводзе ў (Мінску, Жодзіне, Магілёве).

14. Першы заалагічны парк на Беларусі быў заснаваны ў (Мінску, Гомелі, Гродне, Бабруйску).

15. Электрыфікацыя беларускай чыгункі пачалася ў (30-х, 50-х, 60-х, 70-х) гадах.

16. Горад Чэрыкаў размешчаны на рацэ (Віхра, Сож, Асцёр, Бася).

17. Бульбаўборачныя машыны выпускаюцца ў (Лідзе, Гомелі, Брэсце, Мазыры).


18. Па тэрыторыі Беларусі праходзіць чыгунка (Санкт-Пецярбург — Масква, Санкт-Пецярбург — Вільнюс, Санкт-Пецярбург — Адэса).

19. На Беларусі вырошчваюць (бавоўнік, грэчку, рыс).

20. З трыма замежнымі дзяржавамі мяжуе (Мінская, Гродзенская, Віцебская, Гомельская) вобласць.

Чайнворд «20 загадак»

1. Старажытны беларускі горад. **2.** Адзін з відаў прадукцыі хімічнай прамысловасці. **3.** Мінерал класа карбанатаў. **4.** Раённы цэнтр на Віцебшчыне. **5.** Рака басейна




Балтыйскага мора. **6.** Цэнтр хімічнай прамысловасці. **7.** Лекавая расліна. **8.** Сорт бульбы. **9.** Горад у Брэсцкай вобласці. **10.** Від паліва. **11.** Рэдкая птушка. **12.** Прыток Заходняй Дзвіны. **13.** Від прадукцыі лёгкай прамысловасці. **14.** Вадаплаўная птушка. **15.** Раённы цэнтр на Гродзеншчыне. **16.** Лясная птушка. **17.** Млекакормячае. **18.** Від карыснага выкапня. **19.** Прадукцыя дрэваапрацоўчай прамысловасці. **20.** Раённы цэнтр у Магілёўскай вобласці.

Галаваломка «Па роднаму краю»

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце «Беларусь».

1. Горад на Бярэзіне. **2.** Горад у Гомельскай вобласці. **3.** Возера ў Крупскім раёне. **4.** Раённы цэнтр на Гомельшчыне. **5.** Прыток Прыпяці. **6.** Горад у Магілёўскай вобласці. **7.** Адзін са старажытных гарадоў. **8.** Прыток Нёмана.



Загадкі «Зямля і нетры»

1. Гэта пераходная форма ад выкапнёвага торфу да каменнага вугалю. Агульныя геалагічныя запасы на Беларусі ацэньваюцца ў 1 млрд т. Шэраг радовішчаў адкрыты на поўдні краіны. Як называецца гэты від карыснага выкапня?

2. Адзін з асноўных пародаўтваральных мінералаў. Яго хімічная формула SiO_2. Што гэта?

3. Як называецца дробназярністая пясчана-гліністая глебаўтваральная парода, якая ўтрымлівае 10—20 % гліністых часцінак?

4. Гэта акруглыя згладжаныя камяні. Сустракаюцца яны часцей у Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі. Іх называюць ... ..

5. Асадкавыя пароды з арганічнага рэчыва і мінеральнай часткі. Маюць карычнявата-шэры і карычнявата-жоўты колер. Від паліва. Іх радовішчы на Беларусі адкрыты ў 60-х гг. Здабыча не вядзецца. Гэта ... .

6. Яго ўжываюць у розных галінах прамысловасці, а таксама ў сельскай гаспадарцы. Яго хімічны састаў $CaMg(CO_3)_2$. У межах Беларусі выяўлена 10 радовішчаў. Вы здагадаліся, што гэта ... .

7. Назва гэтай пароды паходзіць ад грэчаскіх слоў. Першае з іх азначае — «гнілы», другое — «глей, гразь». Агульныя запасы гэтых глеевых адкладаў на Беларусі каля 4 млрд т. Утварэнне іх прадаўжаецца ў сучасную эпоху. Як называюць гэты від карысных выкапняў?

8. На Беларусі іх знойдзена 5. Усе яны маюць назвы: «Брагін», «Грэск», «Забродцзе», «Жмені», «Чорны Бор». Размова ідзе пра ... .

9. Яшчэ старажытныя людзі выкарыстоўвалі гэты мінерал у якасці каменных прылад і крэсіва. Ён мае шэры, жаўтавата-шэры да чорнага колер. Гэта ... .

10. Выкапнёвая смала самых розных колераў і адценняў. Выкарыстоўваецца ў фармацэўтычнай, парфумернай, хімічнай прамысловасці, для вытворчасці ювелірных вырабаў. На Беларусі знойдзена ў розных месцах. Назва акамянелай смалы — ... .

Віктарына «Незакончаныя сказы»

Закончыце прыведзеныя ніжэй сцвярджэнні, або ўстаўце прапушчаныя словы.

1. Самае вялікае возера Беларусі — Нарач, самае глыбокае ... .

2. Дрыса, Дзісна, Лучоса — гэта прытокі ... .

3. Тэрыторыю Беларусі можна падзяліць на ... прыродна-гаспадарчыя раёны.

4. ...— самы старажытны горад Беларусі.

5. Самая высокая шчыльнасць насельніцтва ў ... вобласці.

6. Гара Замкавая — вышэйшая кропка ... ўзвышша.

7. Абсалютныя вышыні больш за 300 м знаходзяцца на Мінскім, Навагрудскім і ... узвышшах.

8. У другой палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пачалося будаўніцтва ... дарог.

9. Аўтамабільныя заводы знаходзяцца ў ..., ... і Мінску.

10. Шыны розных дыяметраў вырабляюць у горадзе ... .

11. У Светлагорску знаходзіцца самае буйное на Беларусі прадпрыемства ... ... прамысловасці.

12. Толькі ў Оршы вырабляюць ... тканіны.

13. Пінск, Тураў, Петрыкаў, Мазыр размешчаны на берагах ... .

14. Зальвянка, Рось, Котра — гэта прытокі ... .

15. Цукровыя заводы размешчаны ў Слуцку, ..., ... і Гарадзеі.

16. Самая магутная ДРЭС нашай краіны — ... .

17. Асіповіцкае і Чыгірынскае вадасховішчы знаходзяцца на тэрыторыі ... вобласці.

18. Налібоцкая пушча — гэта вялікі лясны масіў у межах ... Беларусі.

19. У Гомельскай вобласці распрацоўваецца ... радовішча каменнай солі.

20. Вядучай галіной лёгкай прамысловасці з'яўляецца ... прамысловасць.

Геаграфічная літарынка

На кожную літару вам прапануецца па тры геаграфічныя назвы. Гэта назвы гарадскіх паселішчаў, рэк, азёр, буйных радовішчаў карысных выкапняў і інш. Вядомы толькі першая і апошняя літары. У кожнай назве ўстаўце літары, якіх нестае.

А

А — — — — — а — Гарадскі пасёлак у Шчучынскім раёне

А — а — Прыток Бярэзіны

А — — — — — ы — Гарадскі пасёлак у Гомельскай вобласці

Б

Б — — — — н — Раённы цэнтр Гомельскай вобласці

Б — — — — — ь — Прыток Сожа

Б — — — — — — к — Горад у Цэнтральнай Беларусі

В

В — — — — — — — — — — — — — е — Гідралагічны заказнік

В — — ь — Левы прыток Прыпяці

В — — — — — е — Горад у Брэсцкай вобласці

Г

Г — — — — — — — — — а Радовішча гліны ў Цэнтральнай Беларусі

Г — — — а Рабочы пасёлак на Магілёўшчыне

Г — — — — ь Рака басейна Дняпра

Д

Д — — я Гарадскі пасёлак на Віцебшчыне

Д — — — — — — — — — — е Радовішча каменнай солі

Д — — — — — — — а Раённы цэнтр Гродзенскай вобласці

Е

Е — — — я Гідралагічны заказнік

Е — — — — — — — а Гарадскі пасёлак на Віцебшчыне

Е — — — к Раённы цэнтр Паўднёвай Беларусі

Ж

Ж — — — — — к Гарадскі пасёлак у Гродзенскай вобласці

Ж — — — а Прыток Нёмана

Ж — — — — н Адзін з чыгуначных вузлоў

З

З — — — — — — — я Гара, вышэйшая кропка Навагрудскага ўзвышша

З — — — — — — — — — — — е Буйное вадасховішча на захадзе Беларусі

З — — — — — — — — — — е Узвышаная раўніна на паўднёвым захадзе

І

І — — — ч Рака басейна Нёмана

І — — — — ц Гарадскі пасёлак у Мінскай вобласці

І — — — — — — — — ы Горад на Брэстчыне

К

К — — — — — ь Гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне

К — — — — — — — — — — я Назва градаў ў Цэнтральнай Беларусі

К — — — а Прыток Нёмана

Л

Л — — — а Гарадскі пасёлак у Гродзенскай вобласці

Л — — — ы Курортная мясцовасць на поўначы Беларусі

Л — — — — — ц — Чыгуначны вузел Паўднёвай Беларусі

М

М — — — ч — Прыток Случы
М — — — — — — — — е — Радовішча каменнай солі
М — — — — — — — — — — — — — а — Вёска, радзіма Якуба Коласа

Н

Н — — — — — — — — е — Гарадскі пасёлак у Мінскай вобласці
Н — — — — — — — а — Возера ў Віцебскай вобласці
Н — — — — — ц — Назва Нёмана ў яго вытоку

О

О — — — ь — Гарадскі пасёлак на Віцебшчыне
О — — — а — Левы прыток Бярэзіны
О — — а — Буйны чыгуначны вузел

П

П — — — — т — Вадасховішча на Палессі
П — — — к — Возера на тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка
П — — — — — — — і — Ландшафтна-гідралагічны запаведнік

Р

Р — — — а — Рака басейна Дняпра
Р — — — — — — — — е — Радовішча нафты
Р — — — — — ы — Гарадскі пасёлак у Брэсцкай вобласці

С

С — — — — — — ь — Возера на тэрыторыі Гродзенскай вобласці
С — — о — Возера на Віцебшчыне
С — — — — — — — — — — — — к — Адзін з маладых гарадоў Беларусі

Т

Т — — — — — я — Прыток Прыпяці
Т — — — — ў — Адзін са старажытных гарадоў
Т — — — — — — н — Раённы цэнтр Віцебскай вобласці

У

У — а — Прыток Заходняй Дзвіны
У — — — — — а — Гарадскі пасёлак у Мінскай вобласці

У — — — — — — — — ы Гарадскі пасёлак у Гомельскай вобласці

Ф

Ф — — — — о Заказнік-журавіннік у межах Расонскага раёна

Ф — — — — — — — — — — — е Возера ў Шумілінскім раёне

Ф — — — — — — — ь Гарадскі пасёлак у Мінскай вобласці

Х

Х — — — — — — і Раённы цэнтр Гомельскай вобласці

Х — — — — — — к Самае ўсходняе гарадское паселішча Беларусі

Х — — — — — а Вялікі балотны масіў на ўсходзе Брэсцкай вобласці, радовішча торфу

Ц

Ц — — — — — — — ы Гарадскі пасёлак у Брэсцкай вобласці

Ц — — — — а Возера на поўначы Беларусі

Ц — — — — — — — е Галоўнае вадасховішча Сляпянскай воднай сістэмы

Ч

Ч — — — — — — — е Возера на Палессі

Ч — — — — — — — — — — — е Вадасховішча ў басейне Дняпра

Ч — — — — — — ў Раённы цэнтр Магілёўскай вобласці

Ш

Ш — — — — а Прыток Нёмана

Ш — — — — — — — — — — — а Раённы цэнтр Віцебскай вобласці

Ш — — — — — н Горад на Гродзеншчыне

Ю

Ю — — — — — — — і Гарадскі пасёлак у Гродзенскай вобласці

Ю — — — — — — — і Заказнік-журавіннік у межах Расонскага раёна


Ю — — — — — — а Невялікая рака, прыток Зальвянкі

Я

Я — — — — — — а Рабочы пасёлак у Магілёўскай вобласці

Я — — — — — — а Прыток Прыпяці

Я — — а Рака, прыток Дзісны



Па блакітных прасторах

Адам Міцкевіч

Да Нёмана

Нёмне, рэчка мая радаводная, дзе
Тыя воды, што браў я ў маленстве ў далоні,
Па якіх потым плыў у самотным палоне
Сэрца ахаладзіць, што зайшлося ў нудзе?

Цень красы тут Лаура сачыла ў вадзе,
Валасы заплятала і ўквечвала скроні,
Вобраз вабны яе ў срэбных хвалях на ўлонні
Я слязамі ў запале муціў у жудзе.

Радаводная рэчка мая, дзе твае
Маладыя крыніцы, што білі няспынна,
Дзе нявінных гадоў навіна і правіна?

Дзе бунтоўнасць,
Якой мне цяпер нестае?
Дзе Лаура мая? Дзе былая сябрына?..
Знікла ўсё, што ж не высахлі слёзы мае!

Алег Лойка

Балада пра Шчару

Да сясцёр сваіх Шчара спяшалася —
Да Гарыні, Ясельды, Цны.
Тыя з Прыпяццю ўжо абдымаліся,
Дружна хвалі гайдалі яны.

Ды што ж гэта са Шчараю сталася?
Затуманіўся сіні зрок?..
На сясцёр, можа, зазлавалася?..
Прыгадала які зарок?..

Ці адчула: Дняпро пераборлівы,
Не яе сваёй назаве?..
Павярнула крутном на бор глухі —
На паўночныя зоры плыве!

Туманы палескія гналіся,
Заступаў шлях дрыгвяністы глей:
«Можа б, Шчара, ты апамяталася,
Ты ж палескіх, нашых крывей?!»

«Не! Дарма! Я нікому не здрадзіла,
Не заплямлю святой дабраты,
Я б успомніць вам толькі радзіла:
І Дняпро ваш і Нёман — браты!..»

І тады туманы адступіліся,
І тады, як з жаданай сястрой,
Нёман хуткі са Шчарай злучыліся
Пад дубамі і вечнай зарой.

Прыпяць хвалямі не адгукаецца,
Суму, радасці не выдае,—
Хоць, вядома, ёй падабаецца,
Што за Нёмнам сваячка яе!..

Алесь Звонак

Вілія

(Урывак)

Вілія, Вілія,
Ціхаплынная сонная рэчка,
На крутым беражку гарадок,
На другім беражку паплавы,
А за імі ружовае мора
Квітнеючай грэчкі,
Аблямоўкаю сіняй удалечы
Бор векавы...

Над Вілейкаю ціша,
У прыцемку сцелецца вечар
Ды мелодыя песні дзявочай
Ліецца здаля;
Над вадою
Нахіленых вербаў
Гамонкае веча,
Ціхамірная, чуе праз сон
Вілія, Вілія...

.....

Цішыня...
Толькі падаюць словы,
Як волава кроплі,
Гэта голас сумлення,
Суровая споведзь мая...
Стому з цяжкіх павек
Ты згані, вецер ціхі і цёплы,
Пыл нялёгкіх дарог
Змый вадзіцай сваёй,
Вілія!..

Ноч.
Нябёс халадок.
Лье Мядзведзіца коўш сямізорны,
Росны водар травы прагна п'е
Перагрэтая сонцам зямля...
Як я ўдзячан табе
За спакой, што табою падоран,
Ціхаплынная рэчка-краса,
Вілія, Вілія!..

Віктар Шымук

Тры рачулкі

Выйду сонечным ранкам
За ваколіцу я.
Як жывеш ты, Ятранка,
Рачулка мая?

Ты шуміш напрадвесні
Між густых лазнякоў.
Гэту простую песню
Чую сёння я зноў.

Ты цячэш без аглядкі,
Шлях скірованы твой
Да сястры, да Маўчадкі,
Да рачулкі другой.

А далей, між паніклых
Кучаравых ракіт,
Ўецца рэчка Паніква,
Ў хвалях — неба блакіт.

Вы — як цуд, як абнова,
Тры рачулкі-сястры.
... Сустракае вас Нёман
У зялёным бары.

Моўчадзь — левы прыток Нёмана, цячэ ў Баранавіцкім і Дзятлаўскім раёнах, даўжыня 98 км.

Ятранка (31 км) і Паніква (16 км) — прытокі Моўчадзі, цякуць у Дзятлаўскім і Навагрудскім раёнах.

Аляксей Зарыцкі

Дняпроўскія кручы

Паталаніла мне: над Дняпром
Рос я.
Змалку вучылася вока —
З круч надрэчных,
З уздыбленых стром
Бачыць гэтак далёка-далёка.
Далячынь нас уладна заве,
Вабіць вечна смугою зыбучай.
І запомніў таму я навек
Пайменна дняпроўскія кручы.
Не паблякнуць таму, не счаўрэць,
Што юнацтвам завязана туга.
Там Турэйка, Равека, Чурэц...
Там Адмолак, там Розмычка, Струга...
Круч дняпроўскіх імёны гучаць,
Быццам назвы легенд і паданняў.
Можна казку пра гэта пачаць
На разгарыстай мове світанняў.
І калі ад тугі і нуды
Зашчыміць маё сэрца знянацку,
Парываюся зноў я туды,
На мой бераг высокі, юнацкі.

Дзе Турэйка, Равека, Чурэц,
Дзе шумяць Кісцянёўскія плёсы,
Дзе так молада ўмеюць сінець
Над ракой старажытнай нябёсы.
Дзе такі неаглядны прасцяг
Адкрываецца з кручы заўсёды,
Дзе на свята святла і жыцця
Так спяшаюцца веснія воды.

Пімен Панчанка

Бярэзіна

(Урывак)

Мы вандроўнікамі ўсе
Знатнымі зрабіліся.
У дарозе пакрысе
Ад сям'і адбіліся.

Наглядзеўся на мадонн
Ціхіх і гарэзлівых...
Каму Тэмза, каму Дон,
Мне — рака Бярэзіна.

Петлі вузенькія ўе
Недзе каля Докшыцаў,
Пераходзіў праз яе
Па маленькай дошчачцы.

З бацькам ездзіў я на рум —
Сосны, воды сінія.
Знаў я кожную нару
І шляхі ласіныя.

Начаваў над ёй не раз
І не мог нагледзецца,
Як плыве рака-зара,
А бярозы свецяцца.

І плыве, і мые жвір,
І нідзе не спыніцца,
З радасцю ў дняпроўскі вір
З галавою кінецца...

.....

Гайна!.. Гайна!..

Гайна!.. Гайна!..
Што за рэчка,— прыгажэйшае няма.

Гайна!.. Гайна!..
З назвай, блізкай да паэтава імя.

Гайна!.. Гайна!..
Хоць малая,— неспакойны нораў твой.

Гайна!.. Гайна!..
Ты, як мора, разліваешся вясной.

Гайна!.. Гайна!..
Раннім летам ззяеш срэбрам у лугах.

Гайна!.. Гайна!..
Што малодка, ўся ў зялёных ты шаўках.

Гайна!.. Гайна!..
Ты пад восень граеш колерам другім.

Гайна!.. Гайна!..
Быццам вежы, над табою скрозь стагі.

Гайна!.. Гайна!..
Позна ўзімку, як удараць халады,

Гайна!.. Гайна!..
Ахінешся белым кужалем тады.

Гайна!.. Гайна!..
Ты як быццам засынаеш у снягах.

Гайна!.. Гайна!..
Твар твой белы, толькі горача ў грудзях.

Гайна — правы прыток Бярэзіны. Цячэ ў Лагойскім, Смалявіцкім і Барысаўскім раёнах. Даўжыня — 100 км.

Генадзь Пашкоў

Прыпяць

(Урывак)

Тваіх крыніц гаючых выпіць
не здолеў час крутых вятроў,
мая любоў
і лёс мой — Прыпяць,
калыска песень і дуброў.

І па вірах туманнай волі
ваду — аж пеніцца зара —
нясеш шырока ўсцяж Нароўлі
і коціш міма Мазыра.

Пакуль зіма не ляжа злая
і плёсы не зашкліць мароз,
за хвалю пенную хапае
ў чорным чадзе рудавоз.
.....

А ў дубняках па сцежках тайных
блукаюць здані туманоў,
сівыя, быццам бы паданні
ля Юравіцкіх курганоў.

І хочацца праз цемрадзь крыкнуць,
каб толькі — рэха ўсцяж ракі:
«Цячы, любоў і лёс наш, Прыпяць,
злучай і сэрцы, і вякі!»

Кастусь Цвірка

Пціч

Паўз бераг — зялёнаю хваляй асокі,
Вада нібы сінька — на фарбы пазыч.
Цячэ, пазбіраўшы па свеце аблокі,
Нікім не апетая Пціч.

Не ўбачыш на люстры яе парахода,
Курортны палац не засвеціць з-за ліп.
Варушыць чарот ад усходу да ўсходу,
Люляе, люляе чаўны ля сяліб.

Ля моста жанкі, падаткнуўшы спадніцы,
За хвалю бяруць яе — мыць ручнікі,
Яна ж вырываецца з рук, жартаўніца,
Імчыцца, адносячы пены шматкі.

Ды доўга няма як разгульвацца плыні:
Нясе на спіне за плытамі плыты,
Варочае жорны каменныя ў млыне
Ды сонца развешвае ўсцяж на драты.

Бяжыць, падбіраючы следам крыніцы,
Дубы падмывае — шторазу дужэй.
Хай песень не чуў я аб ёй, працаўніцы,
Ды мне за ўсе рэкі яна прыгажэй!

Кастусь Цвірка

Рэчка Красная

Назвалі рэчку — Красная.
Здавён бруіць яна
Між берагоў, што краскамі
Усыпала вясна.

Паціху лугам коціцца
Пад хмарку нацянькі —
І серабрацца ў коціках
Абапал лазнякі.

Згубіўшы ў вольхах старыцу,
Што ўсю заняў аер,
Цячэ далей, стараецца,
Дарогу ў свет віе.

Ля белае завоіны,
Дзе плешчуць акункі,
Над паплаўкамі — во яны! —
Застылі хлапчукі.

Вада — бы і няма яе,
Бы, як сувой, між траў
Само тут неба мая
Па лузе хто паслаў.

Усё — як на далоні ў ёй:
І ліст вярбы сівой,

Што стала, буйнакроная,
У бездань галавой,

І хвойніка-шматзвонніка
Крыло ўдалечыні,
І ўсход вясёлы сонейка,
І вечара агні,

Зара каляна-ясная
З кругамі бакаса...
Цячэ рачулка Красная —
Зямлі маёй краса.

Красная — невялікая рака, левы прыток Пцічы, даўжынёй усяго 16 км. Цячэ ў Бабруйскім і Глускім раёнах.

Пятрусь Броўка

Размова з Дзвіною

(Урывак)

Ты з дзён юнацтва па сягоння
Прываражыла да сябе.
Дзвіна! Дзвіна!.. І слова звоніць,
Як толькі ўспомнім пра цябе.

А хваляў колер сіні-сіні,
Адкуль іх вецер назганяў...
Напэўна, ў іх глядзеў Скарына,
Калі ў рад літары складаў.

І з тых часоў да нашых ранняў,
Праз даль стагоддзяў ідучы,
Калі пачуеш: «Палачанін!»,
Дык сэрцу радасна: гучыць!

Павел Прудніка ў

З табою, Асцёр!

Далёкае, юнае, светлае,
Як казка мільгнула, як сон...
Паўвека блукаю па свеце я,
А сэрцам к табе не засох.

Як доўга з табою ў разлуцы мы,
Мой добры і ціхі Асцёр!..
Праз годы з буранамі, кручамі
Я зноў к табе рукі прасцёр.

Успомніў дзяцінства гады я:
Маркотна шумела трысцё...
Цяпер жа сады маладыя
Цвітуць над табою, Асцёр.

І зоры зямныя, бясконцыя
Над люстрам тваім зіхацяць,
І песні натхнёныя, творчыя
Ў бязмежную далеч ляцяць.

Прайшоў праз шматлікія далі я,
А з сэрца цябе я не сцёр.
Гады мае блізкія, дальнія
Навечна з табою, Асцёр!

Асцёр — левы прыток Сожа. Цячэ па тэрыторыі Расіі і Беларусі. У межах Беларусі даўжыня каля 50 км — у Клімавіцкім і Крычаўскім раёнах.

Ганна Зінкевіч

Роднае

Зорка ў хвалю глядзіцца,
Месячык мые сярпок —
Плаўна цячэ Аржаніца —
Сініх азёр паясок.

Звонка струменіць вадзіца,
Студзіць падэшвы пясок...
Песняй гучыць — Аржаніца! —
Роднай зямлі галасок.

Аржаніца — рака даўжынёй 35 км у басейне Дзісны, у Глыбоцкім раёне.

Займалка «Рэкі»

Ніжэй прыведзены назвы 20 беларускіх рэк. Кожная з іх працякае ў межах толькі адной вобласці. Вызначце з дапамогай карты, па тэрыторыі якой вобласці працякае кожная з названых рэк. Падказка: у Мінскай і Гомельскай абласцях — па 4 ракі, ва ўсіх астатніх — па 3.

1. Асцёр. **2.** Бася. **3.** Ведрыч. **4.** Гайна. **5.** Дзітва. **6.** Дрыса. **7.** Іпа. **8.** Котра. **9.** Мнюта. **10.** Мышанка. **11.** Нача. **12.** Пліса. **13.** Проня. **14.** Рось. **15.** Стыр. **16.** Сха. **17.** Убарць. **18.** Уза. **19.** Ула. **20.** Ясельда.

Займалка «Азёры і вадасховішчы»


Ніжэй прыведзены назвы 20 азёр і вадасховішчаў Беларусі. Вызначце, на тэрыторыі якіх абласцей размешчана кожнае з іх. Падказка: у Мінскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцях па 4, у Гомельскай і Гродзенскай — па 3, у Магілёўскай вобласці — 2 возеры ці вадасховішчы.

1. Асіповіцкае вадасховішча. **2.** Богінскае возера. **3.** Берштаўскае возера. **4.** Вераўскае возера. **5.** Воўпаўскае вадасховішча. **6.** Возера Кромань. **7.** Вадасховішча Лактышы. **8.** Возера Ласвіда. **9.** Возера Лукомскае. **10.** Лукоўскае вадасховішча. **11.** Возера Мядзел. **12.** Возера Крушынаўскае. **13.** Вадасховішча Пагост. **14.** Спораўскае возера. **15.** Сяргееўскае возера. **16.** Возера Тартак. **17.** Вадасховішча Чачора. **18.** Чыгірынскае вадасховішча. **19.** Чырвонае возера (Князь-возера). **20.** Чырвонаслабодскае вадасховішча.

Галаваломка «Рэкі»


Правільна адкажыце на пытанні і ў выдзеленым слупку вы прачытаеце назву прытока Заходняй Дзвіны.

1. Прыток Дняпра. **2.** Рака агульнай даўжынёй 613 км. **3.** Прыток Нёмана. **4.** Прыток Пцічы. **5.** Невялікая рака на поўначы Брэсцкай вобласці. **6.** Рака ў Беларускім Паазер'і.



Галаваломка «Азёры»

Калі вы правільна адкажаце на пытанні і запоўніце гарызантальныя рады назвамі азёр, у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву аднаго з азёр на Палессі.



1. Возера ў Расонскім раёне. **2.** Возера ў паўднёвай частцы Віцебскай вобласці. **3.** Самае вялікае возера Беларусі. **4.** Возера на Браслаўшчыне. **5.** Возера ў Брэсцкай вобласці. **6.** Другое па плошчы возера на тэрыторыі Беларусі.

* * *

Віктар Гардзей

Ля Браслава звоняць крыніцы.
Азёры Наддзвіння бруяць.
І вербы схіляюцца ніца,
І вёслы, і вёслы блішчаць.

Якая ж нязменная сіла
І вабіць сюды, і заве,
Дзе Нарач нябёсы ўтапіла,
Дзе Свіцязь плюскоча ў траве.

Запеў пастушковае дудкі
Ля плёса яшчэ не замёр.
І росна цвітуць незабудкі
Маіх беларускіх азёр.

Пятрусь Броўка

На Браслаўшчыне азёры...

На Браслаўшчыне азёры
Сінія, як неба ўранні,
Што ў аправе ў гонкім лесе.
Па начах злятаюць зоры,
Мыюць твары да світання
І знікаюць у паднябессі...

На Браслаўшчыне азёры
Чарацінамі затканы,
Усміхаюцца пад сонцам...
Глянеш сам, і нікне змора,
Дно, што ў золаце пясчаным,
Піў і піў бы з іх бясконца...

На Браслаўшчыне азёры
Як не бачыш год ці болей,
Так і хочацца сустрэцца;
Што б ні зведаў — горы, моры,
А азёраў тых ніколі
Не забыцца...
Любіць сэрца!

Мікола Хведаровіч

Нарач

На Нарач кладуцца сівыя туманы
І беляць чупрыны курчавыя соснаў.
А чайкі крычаць і крычаць несціхана
Пад хваль тваіх, Нарач, задумлівы плёскат.

Адвечнага раю шукалі народы —
Тлуміла галовы легенда старая.
Я слаўлю твае нарачанскія воды,
Не трэба на свеце святлейшага раю.

Тут сонца ўстае з-за высокага бору
І ў люстра глядзіцца крыштальных азёраў.
А вецер хвалюе ў бязмежным прасторы
Духмянага жыта шумлівае мора.

Заўсёды ў паходзе маё пакаленне
Нап'ецца з твае жыватворнае чашы
Празрыстых, як неба, як сонца, струменяў.
О Нарач! Краса беларуская наша.

Паўлюк Прануза

На Свіцязі

Прыціхлі яліны, бярозы,
Зляцеў з іх асенні ўбор.
У Свіцязь упалі нябёсы
І свецяць рамонкамі зор.

А месяца човен празрыста
Павольна плыве ў вышыні.
Прыемна і ўрачыста
Ад звонкай, густой цішыні.

А свежым, з расінкамі ранкам,
Як зоймецца толькі зара,
Чутно, як пяюць свіцязянкі
З Нясвіжа, з Карэліч, з Міра.

Алесь Ставер

Палік

(Урывак)

Абапал Бярозы лугі і лугі...
Званочкамі клічуць сюды мурагі,
Халодныя косы на сонцы блішчаць,
Аблокі плывуць над стагамі.
З крыніц ручайкі да Бярозы імчаць,
Бы яшчаркі, ўюцца лугамі —
Рака іх збірае няведамы лік
І льецца ў шырокі блакітны Палік.

Навокал адвечны балотны прастор,
А далей задумліва высіцца бор,
Дзе кожная птушка гаворыць са мной,
Кране лось галінку рагамі,
Мядзведзь часам след праштампуе тут свой,
Наступіць на хатку з бабрамі,
Чуваць над балотам гусей дзікіх крык,—
Як любы ты сэрцу, мой родны Палік!

Палік — возера на тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Плошча — 7,7 км^2.

Станіслаў Шушкевіч

Ля возера Вечалле

Калісьці раніцай уздоўж
Хадзіў ля возера я Вечалле.
Як змей, звісаў з абрыву лоўж,
Аж дуб спалоханы самлеў.

Былых крывавых дзён сляды
У завадзі я ўбачыў вязкай,

Тырчала ржавая з вады,
Прабітая чужая каска.

Праменні залацістых хваль
Старую вабілі ляшчыну,
Такую ж і ў вадзе амаль
Уніз вяршыняй хтосьці кінуў.

На бераг лозы ўпалі ніц,
Струменьчыкі цяклі ля іх,
Пачатак бралі з тых крыніц,
Дзе драч крыклівы толькі сціх.

Нядаўна я хадзіў, гасціў,
Быў салаўём зачараваны,
А водар крашанскіх мясцін
Зрабіў мяне як апантаным.

Ад светлай радасці п'янеў,
Глядзеў, прачнуліся каменні.
Тут сябра добрага сустрэў,
Быў ад яго я ў захапленні.

Вечалле — невялічкае возера ў басейне ракі Крашанка ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Плошча — 1,4 км^2.

Кастусь Цвірка

Возера

Хто яго кінуў сюды, у імхі,
З сіняю хваляй ды чайкаю?
Б'ецца паціху аб бераг глухі,
З дзіўнаю назвай — Скачальскае.

Помню, праз ельнік пад лыскавы брэх
Босыя беглі пад градам мы:
Недзе ў затоцы, казалі, бярэ
Воду азёрную радуга.

Вечарам, мокрыя па жываты,
Ледзьве пляліся задворкамі:
Зноўку аблазілі ўсе чараты,
Ды — як растала — вясёлка ў іх!


Сёння ж, ледзь толькі пад хмаркаю дзесь
Бразнуць ключы жураўліныя,

Кідаю ўсё: хоць на дзень, хоць на дзень —
Да берагоў з журавінамі!

Плешчуцца, плешчуцца хвалі сабе,
Гонячы лісце пакорнае:
Недзе ў тумане восень скубе
Беразнячкі прыазёрныя.

Так бы й стаяў каля светлай вады,
Слухаў, як ціха аер пяе.
Тут вось, у возеры гэтым, заўжды
Сэрцам натхненне я чэрпаю.

Скачальскае — невялікае возера ў басейне Пцічы, у Старадарожскім раёне. Плошча — 0,45 км^2.



Раслінны і жывёльны свет

Наталля Арсеннева

Май

Абляцелі вішні... Пагусцелі клёны,
зашумеў, бы ўлетку, свежы, новы гай,
праляцеў нячутна красавік зялёны,
на зямлі пануе светла-пышны май.
Пасінела й неба... Ласкай залатою
залівае сонца поле і мяне.
Пасмаю сівою проста прада мною
таюць плямы-горы недзе ў тумане.
Сонца шчыра грэе. Хораша ў полі,
зацвітаюць краскі між травы густой.
Чую ўсёй душою, што я зноў на волі,
што ізноў у сэрцы — веснавы настрой!
Сцень паклаўся сіні ад бярозаў тонкіх
на дыван, заліты залатым святлом.
У красе калінаў, у лістках рамонкаў
свецяцца расінкі, з маладым лісцём
ветрычак жартуе, а ўгары, у нябёсах
белыя хмарыны заплятаюць сець.
Пад гарой палоскі маладых калоссяў
зырка зелянеюць... Хочацца глядзець,
заглядаць бясконца ў блакіт празрысты,
аб нічым не думаць, толькі сніць а сніць,
сніць аб сінім небе, гэткім чыстым, чыстым,
і аб сонцы й шчасці, што мне значаць дні

Лясам Беларусі

(Урывак)

З маленства люблю я лясы,
Іх сцішаны голас і шум патаёмны,
І пушчы глухія, а ў іх бураломы,
Дзе віхры гудзелі пад гулкія громы
Ды слалі дажджоў абрусы.

Вучыў мяне лес пазнаваць
Прыгожства, суладнасць і чары прыроды,
Дзе птаства спраўляе штогод карагоды,
Дзе тояць крыніцы празрыстыя воды
Для рэчак, каб край умываць.

Ой, лес, беларускі наш лес!
Я песень за век свой злажыў табе многа,
У свет праз цябе мне ляжала дарога,
Ты песціў юнацкасць, і цешыць старога
Сягоння твой полаг-навес.

Віктарына «Па старонках Чырвонай кнігі Беларусі»

Ніжэй прыводзяцца апісанні асобных відаў рэдкіх і ахоўных жывёл і раслін Беларусі, занесеных у Чырвоную кнігу. У канцы кожнага апісання трэба паставіць пытанне «Хто гэта?» або «Якая гэта расліна?». Адказаць на іх можна з дапамогай Чырвонай кнігі Беларусі.

1. Млекакормячае сямейства пустарогіх. Самы буйны прадстаўнік беларускай фауны. Харчуецца травяністай і дрэвавай расліннасцю. Занесены ў міжнародную Чырвоную кнігу.

2. Драпежная птушка сямейства яструбіных. Даўжыня цела 70—95 см, размах крылаў да 2 м. Сустракаецца на лясных астравах, буйных балотах у Паазер'і і на Палессі. Харчуецца птушкамі, амфібіямі, буйнымі насякомымі.

3. Вельмі рэдкая птушка. Гняздзіцца пераважна на поўначы Беларусі каля багатых рыбай вадаёмаў. Самкі буйнейшыя за самцоў. Адлятае на зімоўку ў сярэдзіне восені.

4. У народзе адна з назваў гэтай птушкі — вадзяны бык. Вельмі скрытная птушка з вялікай галавой, масіўным клювам і доўгай шыяй. Гнёзды будуе па забалочаных берагах азёр, сажалак, у зараслях чароту, асакі і трыснягу.

5. На Беларусі гэтая рыба знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Рэдка сустракаецца ў басейнах Нёмана, Дняпра і Заходняга Буга. Трымаецца часцей на ўчастках рэк з камяністым грунтам і хуткай плынню. Ікра ядавітая. Народная назва — марэна.

6. Гэтая рыба захавалася з ледавіковага перыяду. Прэснаводная форма ласося-тайменя. Любіць хуткае цячэнне, халаднаватую ваду. Нерасціцца ў лістападзе — снежні.

7. Вельмі рэдкі прадстаўнік рукакрылых. Трымаецца пераважна ў змешаных пасадках з дуплаватымі дрэвамі. Харчуецца насякомымі. Карысны для лясной і сельскай гаспадаркі. У канцы лета — пачатку восені адлятае на зімоўку ў Заходнюю Еўропу.


8. Адна з самых прыгожых на Беларусі раслін. Расце ў вадаёмах. Буйныя белыя пялёсткі прыемна пахнуць. Чаранок ліста доўгі, цягнецца ад карэнішча ўверх праз усю тоўшчу вады.

9. Вельмі рэдкі рэліктавы від роду вечназялёных ліян. Ва ўмовах Беларусі гэтая расліна не цвіце. Яе звілістае сцябло сцелецца па зямлі і зрэдку ўзбіраецца па ствалах дрэў пры дапамозе паветраных карэньчыкаў-прысосак.

10. Звер сямейства куніцавых. Жыве ў лясах на ўзвышаных месцах, дзе рые разгалінаваную сістэму нор, часцей паблізу вадаёмаў. Актыўны ноччу. Харчуецца разнастайнай ежай. Футра малакаштоўнае, тлушч выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне.

Чайнворд «Прырода Беларусі»

1. Буйны, яркі, прыгожа афарбаваны матыль. **2.** Беспазваночная жывёла атрада весланогіх ракападобных. **3.** Рэдкая птушка сямейства сакаліных, занесеная ў Чырвоную кнігу Беларусі. **4.** Род шматгадовых травяністых раслін. **5.** Возера ў Астравецкім раёне. **6.** Род травяністых раслін. **7.** Правы прыток Заходняй Дзвіны. **8.** Расліна сямейства парасонавых, занесеная ў Чырвоную кнігу. **9.** Род шматгадовых травяністых раслін. **10.** Аднагадовая і шматгадовая расліна — кармавая, меданосная, лекавая, дэкаратыўная. **11.** Аднагадовая травяністая расліна. **12.** Во-




зера ў Брэсцкай вобласці. **13.** Невялікая рака басейна Друці на тэрыторыі Быхаўскага раёна. **14.** Драпежная птушка. **15.** Возера на Віцебшчыне. **16.** Возера на Браслаўшчыне. **17.** Хвойнае дрэва. **18.** Пеўчая птушка атрада вераб'іных. **19.** Дзённы матыль сямейства парушнікаў. **20.** Рака ў Гродзенскай вобласці. **21.** Рака ў Аршанскім раёне. **22.** Возера ў Міёрскім раёне.


Галаваломка «Белавежская пушча»

У контуры са словам *«Белавежская»*: **1.** Млекакормячае сямейства куніцавых. **2.** Лекавая расліна. **3.** Птушка сямейства цецеруковых. **4.** Распаўсюджанае дрэва. **5.** Дзікарослая лекавая расліна. **6.** Ліставае дрэва. **7.** Жывёла атрада насякомаедных. **8.** Драпежная жывёла. **9.** Распаўсюджаная паляўніча-прамысловая жывёла. **10.** Жывёла, завезеная з Паўночнай Амерыкі. **11.** Млекакормячае сямейства аленевых.

У контуры са словам: *«пушча»:* **1.** Бясхвостая амфібія. **2.** Буйная птушка. **3.** Рыба. **4.** Прадстаўнік паўзуноў. **5.** Распаўсюджаная млекакормячая жывёла.



Чайнворд «Чортаў тузін»




1. Рэдкая птушка атрада сокалападобных. **2.** Птушка ліставых і змешаных лясоў. **3.** Шыракалістае дрэва. **4.** Птушка балот і заліўных лугоў. **5.** Ядомы грыб. **6.** Водарасць. **7.** Балотная расліна. **8.** Род шматгадовых травяністых раслін. **9.** Гарадское дрэва. **10.** Род сінезялёных водарасцей. **11.** Драпежная птушка. **12.** Род двух- і шматгадовых травяністых раслін, кустоў і паўкустоў. **13.** Рэдкая водная расліна Палесся і Паазер'я.

Галаваломка «Дрэвы»

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву яшчэ аднаго ўсім вядомага дрэва.

1. Хвойнае дрэва. **2.** Самая распаўсюджаная на Беларусі парода дрэў. **3.** Род кустоў і дрэў сямейства ляшчынавых. **4.** Рэдкае для Беларусі дрэва сямейства хваёвых. **5.** Ліставае дрэва з густой кронай. **6.** Дрэва з чырвонымі пладамі.



Цікавыя звесткі

● На Беларусі вядома 18 відаў дзікарослых вербаў. Найбольш распаўсюджаны белая вярба, або белалоз, вербалоз і ракіта. Вярбу нярэдка выкарыстоўваюць для замацавання пяскоў і яроў. З маладых парасткаў вярбы плятуць кошыкі. Вярба — цудоўны меданос.

● Брусніцы па ўзросту могуць параўнацца з дрэвамі-патрыярхамі.

● На галінках дарослай сасны налічваецца да 40 мільёнаў хваінак. Сасновая хвоя трымаецца 2—3 гады, яловая — 6—7 гадоў. Даўжыня каранёвай сістэмы сасны перавышае даўжыню каранёў елкі ў 12 разоў.

● З адной ліпы пчолы могуць сабраць да 12 кг мёду, столькі ж, як і з аднаго гектара пасеваў грэчкі.

● Вядома больш за 200 відаў лёну — шматгадовых і аднагадовых раслін, пашыраных ва ўмераных і субтрапічных шыротах. У якасці культурнай расліны вырошчваюць усяго некалькі відаў лёну, на Беларусі адзін з іх — лён-даўгунец.

Расліны-драпежнікі

Ці ведаеце вы, што драпежнікі ёсць не толькі сярод звяроў, птушак, але і сярод раслін? Як ні дзіўна, але гэта так. Раслін-драпежнікаў на Беларусі нямнога. Раскажам пра дзве драпежныя расліны.

Расянка круглалістая расце на тарфяных балотах.

Гэта тоненькая чырванаватая травінка. Яе маленькія лісцікі-пласцінкі па акружнасці пакрыты высокімі чырванаватымі валасінкамі, а ў цэнтры — нізкімі. На патоўшчаных кончыках валасінак блішчаць кропелькі вадкасці. Яны падобныя на расу, адсюль і назва расліны. Але вадкасць гэтая ліпкая. Камар, які апускаецца на расянку, прыклейваецца лапкамі і ўжо не можа вырвацца. Валасінкі-частакол ахопліваюць ахвяру, лісцік скручваецца і высмоктвае цела камара.

Яшчэ адна насякомаедная расліна — плывунец. Расце ў сажалках, зарастаючых азёрах, канавах, на балотах. Расліна не мае карэнняў і свабодна плавае на вадзе. Даўжыня сцябла можа перавышаць 1 м. На сцябле размешчаны разгалінаваныя ніткападобныя лісці, на якіх знаходзяцца лоўчыя пухіркі. Гэта мяшочкападобныя патаўшчэнні з клапанамі, пакрытыя ўнутры залозістымі валаскамі. У пухіркі трапляюць пры дакрананні да іх водныя насякомыя, рачкі, маляўкі рыб. Адбываецца засваенне іх раслінай.

Жук-алень

Гэта самы буйны сярод жукоў фауны Беларусі. Жыве ён у лісцевых лясах, пераважна ў старых дубровах. Трапляецца ў цэнтральнай частцы Палесся — Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Столінскім раёнах, а таксама ў Белавежскай пушчы.

У самца моцна развіты верхнія сківіцы, якія па форме нагадваюць вялікія рогі аленя. Адсюль паходзіць і назва гэтага насякомага. Цела яго чорнае, матавае; у самца надкрылы і верхнія сківіцы карычневыя, у самкі чорныя. Даўжыня цела дасягае 75 мм. Кормяцца жукі сокам, што выцякае з параненых ствалоў і галін дуба. Каля ранак, з якіх выцякае сок, збіраецца іншы раз шмат жукоў-аленяў. Яны нярэдка ўступаюць у бойку паміж сабою, адганяючы адзін аднаго.

У ліпені—жніўні жукі з гудзеннем лётаюць вакол вершалін дрэў. Жук-алень занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Віктарына «Флора і фауна Беларусі»

1. Якая балотная расліна валодае антысептычнымі ўласцівасцямі?

2. Чаму для замацавання пяскоў саджаюць сасну?

3. У якім узросце зацвітае дуб?

4. Якая травяністая расліна мае непрыемны мышыны пах?

5. Якія ягады лічаць самымі «вітаміннымі»?

6. Якую расліну лічаць самай духмянай?

7. Ці можна па кветках вызначыць, колькі гадзін?

8. Плады якой расліны выкарыстоўваюцца ў піваварэнні?

9. Які небяспечны шкоднік сельскагаспадарчых раслін быў упершыню выяўлены на Беларусі ў 1956 г.?

10. Якая пеўчая птушка вясной спявае раней за іншых?

11. Якая птушка насвістае да 2000 мелодый?

12. Футра якой жывёлы прынята за эталон трываласці?

13. Якога небяспечнага садова-агароднага шкодніка называюць ваўчком, ці земляным ракам?

14. Якая птушка можа паварочваць галаву на 270°?

15. Якія млекакормячыя за суткі з'ядаюць ежы ў 2 разы больш, чым маса іх цела?

16. Якія млекакормячыя пры адсутнасці корму на працягу 9—10 гадзін гінуць?

17. Якая рыба мяняе афарбоўку ў залежнасці ад умоў асяроддзя, узросту і пары года?

18. Якія жывёлы глыбей за іншых пранікаюць у зямлю?

19. Чым пераважна харчуецца змеяед?

20. Калі на Беларусі быў акліматызаваны янот-паласкун?

Віктарына «Ці ведаеце вы грыбы»

1. Як называецца навука аб грыбах?

2. Які грыб называюць «двайніком» белага грыба?

3. Які грыб мае ножку вышынёй да 30 см і шапку ў дыяметры да 25 см?

4. Якія ядомыя грыбы растуць на пнях і ламаччы?

5. Якія яшчэ назвы мае падбярозавік?

6. Якімі грыбамі лечацца ласі?

7. Назавіце некалькі грыбоў, мякаць якіх пры дакрананні сінее.


8. Якія ядомыя грыбы растуць групамі на лугах, палях, агародах, у садах?

9. Які грыб мае назву жывёлы?

10. Якія грыбы з прыведзенага ніжэй пераліку з'яўляюцца ядавітымі: падасінавік, бяляк, мухамор, апенька несапраўдная, рыжык, грузд, перцавы грыб, масляк, зялёнка?

Галаваломка «Грыбы»

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву ядомага грыба.



1. Грыб, які расце групамі на лугах, палях, агародах, у садах. **2.** Распаўсюджаны ядомы грыб. **3.** Атрутны грыб. **4.** Ранні веснавы грыб. **5.** Грыб, што выкарыстоўваецца для засолу. **6.** Ядомы грыб. **7.** Грыб, мякаць якога мае белы, пякуча-востры млечны сок.

Дапішыце словы


Назвы многіх раслін і жывёл складаюцца з двух слоў. З прыведзенага ніжэй пераліку падбярыце адпаведнае слова да кожнай назвы.

1. Зязюлін ... . **2.** Карэльская ... . **3.** Балотны ... . **4.** Лугавы... .**5.** Баранец ... . **6.** Піхта ... . **7.** Гарлачык ... . **8.** Кадзіла ... . **9.** Павойнік ... . **10.** Вадзяны ... . **11.** Купальнік ... .**12.** Меч-... . **13.** Шпажнік ... . **14.** Мядзведжая ... .**15.** Вялікая ... . **16.** Звычайная ... . **17.** Арлан-... . **18.** Чорны ... . **19.** Чаротная .... **20.** Мёртвая .... **21.** Жук-.... **22.** Шыракапальцы .... **23.** Бакаплаў ... . **24.** Янотападобны ... .

Другое слова ў назве: мірт, сармацкае, бусел, рапуха, сабака, лён, бяроза, белахвост, белы, горны, балотны, начніца, палятуха, белая, чай, трава, прамы, рак, арэх, Паласа, звычайны, цыбуля, галава, алень.

Галаваломка «Рыбы»


Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву рыбы, што водзіцца ў рэках і азёрах нашага краю.




1. Драпежная рыба. **2.** Нешматлікая рыба рэк. **3.** Рыба, занесеная ў Чырвоную кнігу Беларусі. **4.** Рыба, што нерасціцца зімой. **5.** Драпежная рыба. **6.** Сажалкавая рыба.

Галаваломка «Ахова прыроды»

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву мемарыяльнага заказніка ў Мінскай вобласці.



1. Рака ў Белавежскай пушчы. **2.** Азёрны заказнік у Паазер'і. **3.** Біялагічны заказнік у Брэсцкай вобласці. **4.** Рака на тэрыторыі заказніка «Блакітныя азёры». **5.** Паляўнічы заказнік. **6.** Заалагічны заказнік на Міншчыне. **7.** Мемарыяльны запаведнік. **8.** Заказнік-журавінник на Палессі. **9.** Адміністрацыйны і навуковы цэнтр Белавежскай пушчы. **10.** Возера ў Бярэзінскім запаведніку.



Паселішчы. Гаспадарка

Генадзь Бураўкін

Песня пра Мінск

Над зялёнай тваёй галавой
Нетаропка плывуць аблокі.
Ля паўдзённага сонца б'юць
Жаўрукі трапяткім крылом.
Я шчаслівую песню нясу
Па праспектах тваіх шырокіх,
Мой любімы, мой родны Мінск,
Мой прасторны і светлы дом.

Мой родны Мінск,
Чароўны Мінск,
Мая сталіца.
Табой заўсёды
Мне ганарыцца.
Мой родны Мінск —
Натхнёнасці крыніца.
Жыві, і слаўся,
І красуйся,
Горад мой!

Поўняць ціхія паркі твае
Закаханых нясмелыя крокі.
Задуменныя плошчы ад сну
Будзіць мірны ласкавы гром.

Не змаўкае дзіцячы смех
На праспектах тваіх шырокіх,
Мой любімы, мой родны Мінск,
Мой прасторны і светлы дом.

Мой родны Мінск,
Чароўны Мінск,
Мая сталіца.
Табой заўсёды
Мне ганарыцца.
Мой родны Мінск —
Натхнёнасці крыніца.
Жыві, і слаўся,
І красуйся,
Горад мой!
Хай вечна свеціць
Сонца над табой!

Адам Русак

Маладзечна, Маладзечна

Маладзечна, Маладзечна
Над ракою быстрацечнай,
Над ракою звонкай, вузкай —
Гарадок наш беларускі.

Ты знарок пабудаваны
На дарогах скрыжаваных.
Усе крыніцы к табе льюцца,
Мне з табой не размінуцца.

Маладзечна, Маладзечна
Ў маладых садах зарэчных.
Хто імя табе такое
Даў на свеце маладое?

Ты цвіцеш у зорах весніх,
Маладзеюць сэрцы ў песнях,
Маладзеюць рукі ў працы,
Што ўзнялі твае палацы.

.....

Маладзечна, Маладзечна,
Мой паклон табе сардэчны.
Жыць у шчасці табе вечна,
Маладзечна, Маладзечна!

Ліда

Журавы крычаць здалёку
Над зямлёю разамлелай.
Красавік, я чую крок твой,
Неспакойны, захмялелы!..

У нязнанасць далячыняў,
Як калісьці, вабяць вёрсты,
Дзе лятуць на крылах сініх
Маладога часу вёсны;

Дзе набраклі сокам жылы
Ў стройным целе тапаліным,
Дзе з табою падружылі
Адвячоркам цёплым, Ліда...
.....

З вас ніхто не будзе ў крыўдзе,—
Калі выпадзе прыгода,
Пабывайце, другі, у Лідзе,
Ліда — мілы слаўны горад!

Ліда стрэне вас па форме
І прыветна, і зычліва,
Канцэнтратамі накорміць,
Пачастуе добрым півам...

Праз Ашмяны, праз Гальшаны,
Міма родных краявідаў
Я імчаўся на спатканне
Да цябе, красуня Ліда!..

Асабліва ў час кіпення
Буйнай квецені вясновай,
Калі дрэвы ў белай пене
Спяць на золаку ружовым...

Асабліва на змярканні,
У разгар вясны пявучай,
У пору першага кахання,
Першых кветак і заручын...

Ліда! Ліда! Мужны горад!
Ты змагла, і неаднойчы,

Адстаяць і чэсць і гонар
Сілай рук сваіх рабочых.

Гэтай сілай небывалай
Гулка дыхаюць заводы,
Беласценныя кварталы
Вырастаюць год ад году...

Ліда! Удалеч толькі гляньце:
Між бярозак беланогіх
Працягнула, нібы пальцы,
Аж ва ўсе канцы дарогі.

Выбірай любую, словам,
Хоць на Гродна, хоць на Вільнюс,
Хоць на Іўе, хоць на Слонім —
Да чаго душа прыхільна!

Толькі я скажу ад сэрца:
Тут пабыў хоць раз калі ты,
Доўга ў памяці не сцерці
Воблік слаўнай мілай Ліды!

Пімен Панчанка

Ода Талачыну

Талачынцы — не злачынцы,
Добрых спраў яны зачынцы:
Ад гарэлкі не шалеюць,
Сеюць лён,
Жывуць з алеем.
А дзяўчынкі — талачынкі,
Як вясновыя хусцінкі,—
Кветкамі прыбраныя,
Вечна закаханыя:
То ў цябе, то ў мяне —
Шчасце дзевак не міне.
Каб сустрэцца з нашай любкай,
Не ў Бабры ты злазь,
Не ў Крупках,
Трэба ў Коханаве злезці —
Спадабаемся нявесце.
А далей — пяшэчкам
З ільняным мяшэчкам:
Не шануем важны чын,
А шануем Талачын.

Хведар Жычка

Я нарадзіўся ў вёсцы Марс

Нямала вёсак ёсць у нас,
Нямала ёсць у вёсак назваў дзіўных.
Пад Жлобінам, у вёсцы Марс
Я нарадзіўся.

Адкуль такая назва?
Даўніны
Не варушыў я — прызнаюся шчыра,—
Ды знаю: крыважэрны бог вайны
Тут не прычына.

Прыгнуты да зямлі работаю зямной,
Да войнаў і разбою не ахвочы,
Відаць, глядзеў далёкі продак мой
У будучынь прароча.
.....

Мы сёння сведкі явы, а не мар:
Лятаць па-над Зямлёй — для нас не дзіва,
Ляціць ракета
На планету Марс.
...У вёсцы Марс я нарадзіўся.

Фёдар Янкоўскі

Паперня

На Вячы, пры дарозе з Мінска, калі выехаць са Старажоўкі на Вільню, на дванаццатым кіламетры ёсць невялікая вёска Паперня. Вёска як вёска, а ў яе назва, само слова... Яно мне — выразнае, гаваркое, жывое. Яно ўжылося ў цэлы ланцужок слоў нашай мовы: пякарня, ганчарня, друкарня, цукраварня... Крышку пра самае апошняе. На Навагрудчыне дзесьці з XVIII стагоддзя збярогся падмурак; гэты падмурак і мясціну называюць і сёння цукраварня: там «варылі» цукар, там быў завод — цукраварня.

А на беразе Вячы рабілі паперу. З таго і Паперня. Гадоў 35 таму назад адзін тутэйшы, з-пад Паперні, чалавек казаў мне: «Пры паляках (акупацыя ў 1920 г.) знайшлі закаркаваны і воскам аблеплены слоік, разбілі яго, а там старадаўняя чыстая папера. І забралі. Не было каму не даць. А ёй, можа, цана залатая».

Чуў я і другое. На Вячы, дзе Паперня, стаяла нека-

лісьці варта, стаяла і паперы (значыць — дакументы) правярала... У Паперні паперы правяралі.

І гэта расказалі каля Паперні. То як быць? Хутчэй за ўсё тут адно дапаўняе другое. Ва ўсякім разе: папера і Паперня — «свае людзі», «сваякі», «крэўныя» (пра ўзнікненне назвы Паперня ўжо было ў друку).

Віктарына «Ці ведаеце вы гарады Беларусі»

1. Назвы якіх гарадоў і гарадскіх пасёлкаў паходзяць ад назваў распаўсюджаных на Беларусі жывёл?

2. Паспрабуйце назваць 12 гарадоў Беларусі, назвы якіх складаюцца з пяці літар.

3. Гэты горад узнік у канцы XIX ст. у сувязі з будаўніцтвам чыгунак на тэрыторыі Беларусі. Цяпер гэта буйны транспартны і прамысловы вузел. Назавіце яго.

4. Некалі — гэта буйны горад, цэнтр вялікага княства на землях дрыгавічоў: цяпер — невялікі гарадскі пасёлак.

5. Адзін са старажытных гарадоў, першая сталіца Вялікага княства Літоўскага.

6. Які горад яшчэ ў XVIII ст. быў вядомы ў Еўропе сваімі ткацкімі вырабамі?

7. Самы старажытны горад Беларусі.

8. Пералічыце гарады, якія ў свой час былі абласнымі цэнтрамі.

9. Назва якога горада супадае з назвай месяца?

10. Самае паўночнае, паўднёвае, заходняе і ўсходняе гарадское паселішча Беларусі.


11. Назавіце адміністрацыйны цэнтр вобласці, якая мяжуе з трыма дзяржавамі.

12. Пералічыце гарады Беларусі, размешчаныя на Дняпры.

Крыжаванка «Гарады і пасёлкі»


Па гарызанталі: **4.** Горад у Магілёўскай вобласці. **6.** Горад на Гродзеншчыне. **8.** Раённы цэнтр Магілёўскай вобласці. **11.** Чыгуначны вузел на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. **12.** Горад на Палессі. **13.** Горад на Дняпры. **14.** Раённы цэнтр Мінскай вобласці.


Па вертыкалі: **1.** Курортны пасёлак. **2.** Горад у Гомельскай вобласці. **3.** Раённы цэнтр на Віцебшчыне. **5.** Гарадскі пасёлак на Міншчыне. **7.** Адзін з маладых беларускіх гарадоў. **9.** Чыгуначная станцыя ў Мінскай вобласці. **10.** Горад на Прыпяці.



Галаваломка «Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ічы»

Выкарыстоўваючы прыведзеныя на малюнку літары, запоўніце кожны радок назвамі гарадоў і населеных пунктаў, якія заканчваюцца на «ічы».






Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ск»

Выкарыстоўваючы прыведзеныя літары, запоўніце кожны радок назвамі гарадоў і пасёлкаў, якія заканчваюцца на «ск».

Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ь»



Выкарыстоўваючы прыведзеныя літары, запоўніце кожны радок назвамі рэк ці населеных пунктаў, якія заканчваюцца на «ь».

Гарады і даты

Да кожнага з прыведзеных у пераліку гарадоў падбярыце дату першага ўпамінання аб ім у летапісе або афіцыйнага аднясення да катэгорыі гарадоў:

Гарады: Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў, Гродна, Брэст, Бабруйск, Барысаў, Орша, Пінск, Мазыр, Салігорск, Полацк, Наваполацк, Старыя Дарогі.

Даты (г.): 862, 1019, 1021, 1067, 1097, 1102, 1128, 1142, 1155, 1267, 1387, 1582, 1963, 1963.

Назвы з двух слоў

Шэраг населеных пунктаў Беларусі маюць назвы, што складаюцца з двух слоў. Паспрабуйце ўставіць словы, якіх нестае ў прыведзеных назвах.

1. Буда-...
2. Зялёны ...
3. ... Слабада
4. ... Горка
5. Вялікая ...
6. Астрашыцкі ...
7. ... Дарогі
8. Сасновы ...
9. ...-Гарадок

З гісторыі гаспадаркі. Падзеі і даты

1. Калі і дзе былі заснаваны першыя на Беларусі шкляныя мануфактуры?

2. Калі на тэрыторыі Беларусі знайшлі калійную соль?

3. У якім годзе быў выпушчаны першы беларускі трактар?

4. Якую электрастанцыю называюць першынцам беларускай энергетыкі? Калі яна была пабудавана?

5. Калі і дзе была заснавана першая на Беларусі папяровая фабрыка?

6. У 1960 г. у Мінск упершыню па трубаправодзе прыйшоў прыродны газ. Адкуль быў пракладзены трубаправод?

7. У якім годзе стаў выпускаць спажыўную соль завод у Мазыры?

8. У якім годзе пачалася прамысловая здабыча нафты ў межах Беларусі?


9. Калі пачаў дзейнічаць Мінскі метрапалітэн?

10. Калі і дзе на Беларусі быў пушчаны першы трамвай? першы тралейбус?

Галаваломкі


Лёгкая прамысловасць

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву буйнога цэнтра лёгкай прамысловасці Беларусі.



1. Цэнтр вытворчасці баваўняных тканін. **2.** Горад на Гродзеншчыне, цэнтр шарсцяной прамысловасці. **3.** Горад, вядомы з XVIII ст. як цэнтр тэкстыльнай вытворчасці. **4.** Цэнтр вытворчасці панчошна-шкарпэткавых, трыкатажных, швейных вырабаў, абутку. **5.** Цэнтр вытворчасці штучнага футра. **6.** Буйнейшы цэнтр лёгкай прамысловасці. **7.** Горад на Магілёўшчыне, у якім размешчаны адзін з ільнозаводаў.


Харчовая прамысловасць



З выкарыстаннем прыведзеных літар запішыце ў кожным радку назвы гарадоў, у якіх знаходзяцца прадпрыемствы розных галін харчовай прамысловасці.

Машынабудаванне


Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву аднаго з вядомых вытворчых аб'яднанняў машынабудавання.



1. Горад — цэнтр выпуску пасажырскіх ліфтаў. **2.** Марка беларускіх трактароў. **3.** Адзін з цэнтраў сельскагаспадарчага машынабудавання. **4.** Цэнтр машынабудавання ў Мінскай вобласці. **5.** Горад аўтамабілебудаўнікоў. **6.** Цэнтр вытворчасці карданных валоў амартызатараў для аўтамабіляў. **7.** Цэнтр вытворчасці кавальска-прэсавых машын. **8.** Горад, у якім вырабляюць электрычныя лямпачкі і газавыя пліты.

Хімічны комплекс

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце назву вядомага вытворчага аб'яднання хімічнай прамысловасці.



1. Цэнтр нафтаперапрацоўкі. **2.** Адзін з цэнтраў вытворчасці хімічных валокнаў і нітак. **3.** Горад, у якім было пабудавана першае буйное прадпрыемства хімічнай прамысловасці Беларусі. **4.** Цэнтр горна-хімічнай вытворчасці. **5.** Цэнтр вытворчасці мінеральных угнаенняў. **6.** Горад, у якім размешчаны буйнейшы лакафарбавы завод. **7.** Цэнтр бытавой хіміі.

Лясная дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць


З выкарыстаннем прыведзеных літар запішыце ў кожным радку назвы гарадоў, у якіх размешчаны прадпрыемствы гэтай галіны.

Б				у			
	і				к		
		ш				і	
Х			н				
	л			і			
		с					
П			с				
				р			

Транспарт

Пры правільных адказах у выдзеленым слупку вы прачытаеце ранейшую назву Дняпроўска-Бугскага канала.

1. Чыгуначны вузел у Гомельскай вобласці. **2.** Горад, які сваім узнікненнем абавязаны будаўніцтву чыгунак. **3.** Прыстань на Прыпяці. **4.** Назва Гродзенскага аэрапорта. **5.** Абласны цэнтр, буйны транспартны вузел. **6.** Горад,



у якім быў пушчаны першы трамвай. **7.** Чыгуначная станцыя на Міншчыне. **8.** Самы буйны транспартны вузел краіны. **9.** Горад на чыгунцы Орша—Крычаў. **10.** Чыгуначны вузел у Брэсцкай вобласці.



Па асобных мясцінах Беларусі

* * *

Мікола Аўрамчык

Мая Бабруйшчына зялёная,
Здаешся іншым ты малой
З тваёй Бярэзінай хвалёнаю
І з непрыкметнаю Алой.

А мне заўсёды паўнаводнымі
Здаваліся іх берагі,
Былі твае мясціны роднымі,
Куток з маленства дарагі.

.....

Не дзіўна, што тут людзі лечацца...
Куды ні траплю — у Туркі,
Панкратавічы або Лейчыцы,—
Мяне сустрэнуць сваякі.

Панюшкавічы дзесь пад бокам тут...
Змаглі адгэтуль у жыцці
З якойсьці Глушы ці з Пабокавіч
На свет пісьменнікі прыйсці.

Накшталт мядзведзя касалапага,
Я ў дол закручваў бур пусты

І мераў ад Хімоў да Ламбава
Твае тарфяныя пласты.

І кожнага сцябла і каліва
Знаў ураджайнасць колькі год:
Ад Міхалёва і да Малева
Калгасны важыў умалот.

Ля Ступянёў і за Цялушаю
Майго кахання з той пары
Сляды нічым не зацярушаны —
Цвітуць пралескамі ў бары.

Калі даяркі варатынскія
Свае спрабуюць галасы,
Дык чуюць слухачы ўсе мінскія
Іх песні дзіўнае красы.

Якія стравы беларускія
Падносіла ты да стала!..
І нават прозвішча бабруйскае
У спадчыну ты мне дала.

Генадзь Бураўкін

Полаччына

Не шукайце красы за морамі,
Узбярэжжаў з крыштальнымі зорамі,—
Прыязджайце да нас на Полаччыну,
Пахадзіце яе прасторамі.

Тут азёры, як неба, сінія,
У чаротах чароды гусіныя,
А на дне Млечным Шляхам свецяцца
Трапяткія гурты язіныя.

Навальніцы грымяць над кручамі,
З гор бягуць ручаі грымучыя,
Тут ля Дрысы сасонкі звонкія,
Над Дзвіною бары пявучыя.

Тут вясёлкай сонца акружана,
Усміхаецца з кожнай лужыны.
Тут на кожнага закаханага
Салаўёў па чатыры тузіны.

Тут дзяўчаты ўсе — чарнабровыя,
На палях ільны двухмятровыя...
Тут пад кожным курганам і каменем —
Ці быліна, ці казка чароўная...

* * *

Анатоль Грачанікаў

Гомельшчына!
Выспы і бары.
Прыпяць...
Сож...
Дняпро...
Між іх — азёры...
Дзе яшчэ сустрэнеце, сябры,
Гэтакае шчырасці ўзоры?
Кажуць людзі: чым гаротней доля,
Тым бліжэй ты да чужога болю...

* * *

Кастусь Цвірка

Палессе...
Рэха правадоў сустрэчных.
Ваюе наш аўтобусік з пяском.
Пад вечар — песня ціхая — Славечна
Дарогу перайшла нам пад мастком.

Куды ляцім, этнографы?
Ля песні
Палатку ўскінем —
Пачакае час!
Тут, пад зарой,
Калі камар не з'есць нас,
Палесся нораў вывучым мы ўраз!

Якая ціш!
Чуваць крынічкі мова —
Хто кінуў нітку срэбную са стром?
А звечарэла —
З чарнаты альховай
На ўсё Палессе —
Салаўіны гром!..

Зялёнакрылы край славян — Славечна...
Дзесь скрыпнуў граб —
Ці мо чумацкі воз?..

Стаю і слухаю самую вечнасць,
Што захавалі
Голлі вербалоз.

* * *

Ніна Мацяш

Спытаюцца: «Адкуль ты?
Скуль ты родам?»
І адкажу:
— З палескай той раўніны,
Якая з даледавіковых часоў
Пароднена і з доляй, і з нядоляй,
О, нездарма яна, мая старонка,
І Белым возерам глядзіць,
Як вечнасць,
І Чорным возерам глядзіць,
Як памяць...
Бярозаўшчына!
Жылкаю блакітнай
Пульсуе Ясельда ў цябе на скроні.
Вясёлыя гаі твае бярозавыя
Нітуюцца з барамі ды з дубровамі,
Каб з травамі, імхамі, чаратамі
Няўзнак на ўвесь зеленасвет Еўропы важыць.
А ці ж не такі і чалавечы лёс твой
Панітаваны з лёсам чалавецтва,
Мая Бярозаўшчына?

Еўдакія Лось

Матыў Магілёўскае шашы

Шлях паслаўся,
Быццам Волга,
Канца-краю не відно,
Будзе Чэрвень,
Будзе Волма,
Будзе тут Беразіно...
Будуць белыя
Бялынічы —
Сцяжынкі талакой.
Як снягурачкі, дзяўчыніцы —
Шафёраў неспакой...
Волма—Волма,
А не Волга,

Чэрвень—чэрвень,
Не іюнь...
Што ты едзеш гэтак доўга?
Пабялела ў полі рунь...
Шлях ад Мінска
Роўны-роўны,
Магілёўская шаша.
Дзень дарогі
Поўны-поўны,
Як паўнюткая душа.
Прабягаюць сосны, ёлкі,
Працякае ўдаль рака.
Поплеч, як дуга вясёлкі,—
Спадарожніка рука...

Павел Прудніка ў

Клімаўшчына

Дзе б ні быў я, куды б ні паехаў —
На любой шырыні, даўжыні —
У сэрцы ты адгукаешся рэхам,
Як юнацтва далёкія дні.

Мне з дзяцінства знаёмы дубровы,
Што шумяць на ўзбярэжжы Астра,
Смех вясёлы дзяўчат чарнабровых
У купальскую ноч ля кастра.

А крыштальныя воды Лабжанкі!
То не казка — цудоўная быль.
Вы таксама знаёмы мне змалку,
І да смерці мне вас не забыць.

Шыр лугоў і палёў васільковых
Там, дзе Іпуць бярэ свой разгон,
Дзе штогод наліваецца колас
І не моўкне лясны перазвон.
.....

Аляксей Зарыцкі

Верце, хлопцы, толькі мне!..

Наша гордасць — Белавежа.
Там, нібыта на падбор,
Высяцца красуні сосны,
Старажытны дрэмле бор.

Слуцак наш садамі славен.
Абыдзі увесь белы свет —
Дзе такая груша-бэра,
Гэткі яблычак-ранет?

А калі нявесту хочаш
Выбраць, друг мой малады,
То спяшайся ў Прыдняпроўе,
Паязджай хутчэй туды.

Там дзяўчат прыгожых многа,
У вачах глыбее сінь.
Там ужо, калі палюбяць,
То заўсёды — назусім.

Хлопцы, слухайце старога,
Верце, хлопцы, толькі мне:
Сам калісь шукаў нявесту
Я ў дняпроўскай старане.

Рыгор Барадулін

На Ушаччыну

— Няйначай,
Зямлячка,
З Ушачы! —
Стракоча сарочы базар.
Чаканне вавёркаю скача,
Стажарыцца смутак з-за хмар.

Самога сябе хоць адкрыў,
Ды з тугой не заключыш умоў.
Па ласку
Ад гора, ад крыўды
Захочацца збегчы дамоў.

Пагоднеюць радасцю вочы.
Нібы птушаня,
Цішыня.
Да гутаркі сэрца ахвоча.
Лапоча
Лістоў малышня.

Рукой да сасны дакраніся —
Быліну даверыць яна.

Шчырэй прыпадзі да крыніцы —
Прагрукае сэрца да дна.

На вуснах чыгункі гарачых
На ўсіх кантынентах даўно:
Уша-
чы-
уша-
чы-
уша-
чы —
Журбоціцца слова адно.

Мікола Пракаповіч

Белая Вежа

Ты з'яўляешся на світанні
З цемры, быццам з глыбінь вякоў,
І блукаюць ля сцен, як здані,
Посвіст стрэлаў і звон падкоў.

Чужынцаў цягнуліся рукі
Да тваёй святой чысціні.
Ты цярпець не хацела прынукі,
Ты не ведала цішыні.

Білі золатам і жалезам,
Чорны дым засцілаў зару,—
Ты стаяла, Белая вежа,
Прыкрываючы Белую Русь...

Над табою карона з промняў —
Аж адвесці нельга вачэй!
Адчуваю, як мужнасць продкаў
Цёплай хваляй у сэрца цячэ.

Васіль Зуёнак

Зялёная пушча

Зялёная пушча — калыска мая —
Галінкаю памяці ў сэрцы.
Пад шатамі звонкімі хлопчык стаяў,
Куванне збіраў у вядзерца.
Паляны — як Млечнага шляху сляды —
Усе закіпалі ў суніцах,

Лічыла зязюля такія гады,
Што ў сне толькі могуць прысніцца!
Зялёнае лета планетай плыло,
У дол прарастала карэннем.
На сцежках лясных распраўляла крыло
Касмічнае пакаленне.
І час гэты выспеў, і год надышоў:
Ракета ўразаецца ў просінь!
А дома — Мядзведзіца зорным каўшом
Зноў мары камусьці прыносіць.
Пад небам лясным — Падбярэззе і Клён,
І воблачкам — Белае ў маі...
Загадкава кліча ў палёт Арыён,
Зялёная пушча вяртае.

Васіль Вітка

Случчына

(Урывак)

Мы на Случы — усе сакуны,
Завомса сакунамі.
Спрадвеку хлеб наш сакаўны
І мова сакаўная.

Звязала рушніком рака,
Тугім вузлом злучыла
З лесавіком палевіка
І дружбе навучыла.

Здавен адзін на аднаго
Мы не глядзелі скосо
І хоць пабачылі усяго —
Усё пережылосо.

Наб'е гузак, хто вытнецца,
Пацэліць той, хто меціцца.
Бо як яно рабіцьмецца,
Дык так яно і мецьмецца.

І нечага аюцкаць,
Калі пастух някемны.
У Слуцку — усё па-людску —
І случакам прыемна.

Яшчэ ў калысцы спіць сысун,
А толькі абазваўся,
І ўжо ён — выліты сакун,
Увесь у бацьку ўдаўся.

Глядзіш, мацнейшыя харчы
У місе падварушвае,
Не трэба нават і вучыць —
Так лыжкай апігушвае.

Расце сабе, у вус не дзьме,
Наказ шануе дзеда:
На Случчыне Андрэй Кузьме —
Заўсёды родны Хведар.


Віктарына «12 пытанняў па карце Беларусі»

1. Самая вялікая па плошчы нізіна Беларусі.
2. Дзе знаходзіцца гара Маяк?
3. Якая рака мае выток і вусце на Украіне, а працякае пераважна па тэрыторыі Беларусі?
4. Самы паўночны адміністрацыйны раён.
5. Дзе знаходзіцца горад Дзісна?
6. У якіх гарадах дзейнічаюць нафтаперапрацоўчыя заводы?
7. Чым вядомы гарадскі пасёлак Руба? Дзе ён знаходзіцца?
8. Да басейна якой ракі належыць Шчара?
9. Вышэйшая кропка Навагрудскага ўзвышша.
10. Па якой раўніне ляжыць шлях з Мінска ў Магілёў?
11. Якая вялікая па плошчы раўніна практычна не мае азёр?
12. Самае буйное па плошчы вадасховішча.

Крыжаванкі «Па Беларусі»


По гарызанталі: **2.** Лістападнае дрэва. **5.** Горад у Віцебскай вобласці. **8.** Культура сямейства гарбузовых. **9.** Род папарацей. **11.** Горад у Мінскай вобласці. **12.** Рыба.

По вертыкалі: **1.** Гарадскі пасёлак у Гомельскай вобласці. **3.** Агародная культура. **4.** Рака басейна Заходняй Дзвіны. **6.** Беспазваночная жывёла. **7.** Лістападнае дрэва. **10.** Травяністая злакавая расліна, пустазелле.



Па гарызанталі: **3.** Распаўсюджаная назва сельскага населенага пункта. **6.** Рака басейна Прыпяці. **7.** Рэдкая птушка. **8.** Птушка. **10.** Рака басейна Нёмана. **11.** Гарадскі пасёлак на Віцебшчыне.

Па вертыкалі: **1.** Возера. **2.** Млекакормячае. **4.** Прыток Заходняй Дзвіны. **5.** Горад на Нёмане. **9.** Драпежны звярок. **10.** Раённы цэнтр Мінскай вобласці.



Па гарызанталі: **4.** Раённы цэнтр Мінскай вобласці **7.** Рака басейна Прыпяці. **8.** Гарадскі пасёлак на Міншчыне. **9.** Драпежная птушка. **10.** Невялікая рака на паўднёвым захадзе Мінскай вобласці. **13.** Травяністая і паўкустовая расліна, перспектыўная кармавая культура. **14.** Прыток Прыпяці. **16.** Рыба сямейства карпавых.

Па вертыкалі: **1.** Возера ў межах Бярэзінскага запаведніка. **2.** Землярыйная жывёла. **3.** Горад у Брэсцкай вобласці. **5.** Возера на поўначы Беларусі. **6.** Паўводная жывёла атрада грызуноў. **11.** Горад у Магілёўскай вобласці. **12.** Цэнтр шаўковай прамысловасці. **15.** Прыток Прыпяці.

Займалка «У час адпачынку»


Вам прапануецца цікавая займалка. У квадратах пад умоўнымі знакамі запісаны лічбы. Гэтыя лічбы абазначаюць: 1) агульную даўжыню асобных рэк Беларусі ў кіламетрах (знак $\rfloor$); 2) плошчу азёр у квадратных кіламетрах (даныя акруглены, знак $\smile$); 3) абсалютныя вышыні асобных кропак (знак $\cdot$); 4) плошчу адміністрацыйных раёнаў у тысячах квадратных кіламетраў (знак у квадраце адсутнічае). Разгадаць, што зашыфравана ў кожным запоўненым

	А	Б	В	Г	Д	Е	Ж	З
1	• 320		| 99	2,3		‿ 53		| 183
2		‿ 36	• 342		| 226			0,7
3		| 113		• 296		| 123	• 323	
4	3,1		| 761		3,4		‿ 15	
5		‿ 80	0,8			| 140	• 221	
6	| 498			3,0	• 173			| 93
7	1,7		‿ 37		| 250	| 295		• 345
8		• 243	| 285	2,9		‿ 44		

квадраце можна з дапамогай энцыклапедычных і даведачных выданняў, карт і Атласа Беларусі.

Прыклад: Вядома, што самае вялікае возера ў Беларусі — Нарач. Яго плошча — 80 км^2. Знаходзім квадрат са знакам ‿ і лічбай 80. Гэта квадрат Б 5. Значыць, Б 5 — возера Нарач.

Так можна расшыфраваць усе лічбы. У добры шлях, сябры!



Адказы

Гэта ты, мая Беларусь

Віктарына «Падарожжа па карце Беларусі»

1. Астравец, Ашмяны, Баранавічы, Пінск. **2.** Гарадок, Рагачоў, Жлобін, Хойнікі. **3.** Пастаўскі. **4.** Астравецкі. **5.** Добруш. **6.** Заходні Буг, Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман, Сож, Асцёр. **7.** Беседзь. **8.** Магілёў. **9.** Гродзенскай. **10.** У Маладзечна — праз Заслаўе, Барысаў — праз Жодзіна, Салігорск — праз Слуцк. **11.** Пінск, Петрыкаў, Мазыр, Нароўля. **12.** Баранавіцкі. **13.** Лагойскага, Чэрвеньскага, Уздзенскага і Бярэзінскага раёнаў.

Віктарына «Выберы правільны адказ»

1. Больш за 10 млн чалавек. **2.** Граніт. **3.** $^{1}/_{5}$. **4.** Мінскім. **5.** Дняпра. **6.** 32,3 тыс. км^2. **7.** Ясельда. **8.** 937 км. **9.** Асвейскае. **10.** Ліпічанская. **11.** Дзярнова-карбанатныя. **12.** Збожжавыя. **13.** Мінску. **14.** Гродне. **15.** 60-х. **16.** Сож. **17.** Лідзе. **18.** Санкт-Пецярбург — Адэса. **19.** Грэчку. **20.** Віцебская.

Чайнворд «20 загадак»

1. Навагрудак. **2.** Корд. **3.** Даламіт. **4.** Талачын. **5.** Нёман. **6.** Наваполацк. **7.** Кісліца. **8.** Агеньчык. **9.** Кобрын. **10.** Нафта. **11.** Асаед. **12.** Дрыса. **13.** Абутак. **14.** Крыжанка. **15.** Астравец. **16.** Цецярук. **17.** Крот. **18.** Торф. **19.** Фанера. **20.** Асіповічы.

Галаваломка «Па роднаму краю»

1. Бабруйск. **2.** Ветка. **3.** Сялява. **4.** Брагін. **5.** Убарць. **6.** Чавусы. **7.** Заслаўе. **8.** Рось.

Загадкі «Зямля і нетры»

1. Буры вугаль. **2.** Кварц. **3.** Супесак. **4.** Валунамі. **5.** Гаручыя сланцы. **6.** Даламіт. **7.** Сапрапель. **8.** Метэарыты. **9.** Крэмень. **10.** Бурштын.

Віктарына «Незакончаныя сказы»

1. Доўгае. **2.** Заходняй Дзвіны. **3.** Тры. **4.** Полацк. **5.** Мінскай. **6.** Навагрудскага. **7.** Ашмянскім. **8.** Чыгуначных. **9.** Магілёве, Жодзіне. **10.** Бабруйску. **11.** Цэлюлозна-папяровай. **12.** Льняныя. **13.** Прыпяці. **14.** Нёмана. **15.** Скідалі, Жабінцы. **16.** Лукомская. **17.** Магілёўскай. **18.** Цэнтральнай. **19.** Мазырскае. **20.** Тэкстыльная.

Геаграфічная літарынка

А Астрына, Ала, Азарычы. **Б** — Брагін, Беседзь, Бабруйск. **В** — Выганашчанскае, Віць, Высокае. **Г** — Гайдукоўка, Глуша, Гарынь. **Д** — Друя, Давыдаўскае, Дзятлава. **Е** — Ельня, Езярышча, Ельск. **Ж** — Жалудок, Жыжма, Жлобін. **З** — Замкавая, Зэльвенскае, Загароддзе. **І** — Іслач, Івянец, Івацэвічы. **К** — Копысь, Капыльская, Котра. **Л** — Любча, Лётцы, Лунінец. **М** — Морач, Мазырскае, Мікалаеўшчына. **Н** — Негарэлае, Нешчарда, Неманец. **О** — Обаль, Ольса, Орша. **П** — Пагост, Палік, Прыпяцкі. **Р** — Раста, Рэчыцкае, Ружаны. **С** — Свіцязь, Саро, Светлагорск. **Т** — Трэмля, Тураў, Талачын. **У** — Ула, Урэчча, Уваравічы. **Ф** — Фаміно, Філіпенскае, Фаніпаль. **Х** — Хойнікі, Хоцімск, Хольча. **Ц** — Целяханы, Цёста, Цнянскае. **Ч** — Чырвонае, Чыгірынскае, Чэрыкаў. **Ш** — Шчара, Шаркаўшчына, Шчучын. **Ю** — Юрацішкі, Юхавіцкі, Юхнаўка. **Я** — Ялізава, Ясельда, Ямка.

Па блакітных прасторах

Займалка «Рэкі»

Брэсцкая вобласць — 10, 15, 20. Віцебская — 6, 9, 19. Гомельская — 3,. 7, 17, 18. Гродзенская — 8, 14, 15. Магілёўская — 1, 2, 13. Мінская вобласць — 4, 11, 12, 16.

Займалка «Азёры і вадасховішчы»

Брэсцкая вобласць — 7, 10, 13, 14. Віцебская — 2, 8, 9, 16. Гомельская — 12, 17, 19. Гродзенская — 3, 4, 5. Магілёўская — 1, 18. Мінская — 6, 11, 15, 20.

Галаваломка «Рэкі»

1. Ведрыч. **2.** Бярэзіна. **3.** Вілія. **4.** Арэса. **5.** Мышанка. **6.** Палата. ДЗІСНА.

Галаваломка «Азёры»

1. Нешчарда. **2.** Лукомскае. **3.** Нарач. **4.** Богінскае. **5.** Белае. **6.** Асвейскае. ЧОРНАЕ.

Раслінны і жывёльны свет

Віктарына «Па старонках Чырвонай кнігі Беларусі»

1. Зубр. **2.** Беркут. **3.** Скапа. **4.** Бугай вялікі. **5.** Вусач. **6.** Стронга. **7.** Вячэрніца гіганцкая. **8.** Белы гарлачык. **9.** Плюшч звычайны. **10.** Барсук.

Чайнворд «Прырода Беларусі»

1. Адмірал. **2.** Лімнакалянус. **3.** Сапсан. **4.** Надбароднік. **5.** Клевел. **6.** Ладдзян. **7.** Нішча. **8.** Астранцыя. **9.** Ятрышнік. **10.** Канюшына. **11.** Аніс. **12.** Спараўскае. **13.** Езва. **14.** Арол. **15.** Лосвіда. **16.** Аболе. **17.** Елка. **18.** Аўсянка. **19.** Апалон. **20.** Неўда. **21.** Аршыца. **22.** Абстэрна.

Галаваломка «Белавежская пушча»

У контуры са словам *«Белавежская»:* **1.** Барсук. **2.** Верас. **3.** Глушэц. **4.** Сасна. **5.** Ядловец. **6.** Ясень. **7.** Вожык. **8.** Рысь. **9.** Вавёрка. **10.** Андатра. **11.** Казуля.

У контуры са словам *«пушча»:* **1.** Рапуха. **2.** Бусел. **3.** Лешч. **4.** Яшчарка. **5.** Заяц.

Чайнворд «Чортаў тузін»

1. Пустальга. **2.** Асаед. **3.** Дуб. **4.** Бекас. **5.** Сыраежка. **6.** Анабена. **7.** Аер. **8.** Раўнаплоднік. **9.** Каштан. **10.** Насток. **11.** Каршун. **12.** Напёрстаўка. **13.** Альдраванда.

Галаваломка «Дрэвы»

1. Елка. **2.** Сасна. **3.** Арэшнік. **4.** Піхта. **5.** Граб. **6.** Рабіна. КАШТАН.

Віктарына «Флора і фауна Беларусі»

1. Сфагнум. **2.** Каранёвая сістэма сасны глыбока пранікае ў глебу. **3.** У 80 гадоў. **4.** Балігалоў. **5.** Ягады шыпшыны. У іх утрымліваецца вітамінаў у 10 разоў больш, чым у лімонах. **6.** Палявую мяту. **7.** Можна. Шыпшына адкрывае свае пялёсткі ў 4—5 гадз. раніцы, а закрывае ў 19—20 гадз. Бульба адпаведна ў 6—7 гадз. і 14—15 гадз. **8.** Хмелю. **9.** Каларадскі бульбяны жук. **10.** Гарыхвостка. **11.** Жаваранак. **12.** Выдры. **13.** Мядзведку. **14.** Балотная сава. **15.** Землярыйкі. **16.** Буразубкі. **17.** Сом. **18.** Земляныя чэрві. **19.** Паўзунамі. **20.** У 50-х гадах.

Віктарына «Ці ведаеце вы грыбы»

1. Мікалогія. **2.** Жоўцевы грыб. **3.** Грыб-парасонік. **4.** Апенькі. **5.** Бабка, абабак, бярозавік, чорнагаловік. **6.** Мухаморамі. **7.** Падасінавік, махавік, сіняк. **8.** Шампіньёны. **9.** Лось. **10.** Мухамор, апенька несапраўдная, перцавы грыб.

Галаваломка «Грыбы»

1. Шампіньён. **2.** Сыраежка. **3.** Мухамор. **4.** Страчок. **5.** Ваўнянка. **6.** Лісічка. **7.** Гаркуха. МАХАВІК.

Дапішыце словы

1. Зязюлін лён. **2.** Карэльская бяроза. **3.** Балотны мірт. **4.** Лугавы чай. **5.** Баранец звычайны. **6.** Піхта белая. **7.** Гарлачык белы. **8.** Кадзіла сармацкае. **9.** Павойнік прамы. **10.** Вадзяны арэх. **11.** Купальнік горны. **12.** Меч-трава. **13.** Шпажнік балотны. **14.** Мядзведжая цыбуля. **15.** Вялікая начніца. **16.** Звычайная палятуха. **17.** Арлан-белахвост. **18.** Чорны бусел. **19.** Чаротная рапуха. **20.** Мёртвая галава. **21.** Жук-алень. **22.** Шыракапальцы рак. **23.** Бакаплаў Паласа. **24.** Янотападобны сабака.

Галаваломка «Рыбы»

1. Шчупак. **2.** Галавень. **3.** Стронга. **4.** Мянтуз. **5.** Акунь. **6.** Карась. ПЛОТКА

Галаваломка «Ахова прыроды»

1. Нараўка. **2.** Крывое. **3.** Селяхі. **4.** Страча. **5.** Асвейскі. **6.** Антонава. **7.** Купалаўскі. **8.** Букчанскі. **9.** Камянюкі. **10.** Палік. КОЛАСАЎСКІ.

Паселішчы. Гаспадарка

Віктарына «Ці ведаеце вы гарады Беларусі»

1. Бабруйск, Дзятлава, Жабінка, Воранава, Бобр. **2.** Мінск, Брэст, Пінск, Слуцк, Мазыр, Масты, Быхаў, Ветка, Горкі, Сянно, Клецк, Ельск. **3.** Баранавічы. **4.** Тураў. **5.** Навагрудак (Навагародак). **6.** Слуцк. **7.** Полацк. **8.** Баранавічы, Полацк, Бабруйск, Мазыр, Маладзечна, Пінск. **9.** Чэрвень. **10.** Г. п. Асвея, г. п. Камарын, г. Высокае, г. п. Хоцімск. **11.** Віцебск. **12.** Дуброўна, Орша, Шклоў, Магілёў, Быхаў, Рагачоў, Жлобін, Рэчыца, Лоеў.

Крыжаванка «Гарады і пасёлкі»

Па гарызанталі: **4.** Крычаў. **6.** Ашмяны. **8.** Касцюковічы. **11.** Лунінец. **12.** Іванава. **13.** Рагачоў. **14.** Вілейка.

Па вертыкалі: **1.** Нарач. **2.** Жыткавічы. **3.** Ушачы. **5.** Радашковічы. **7.** Новалукомль. **9.** Пухавічы. **10.** Петрыкаў.

Галаваломка «Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ічы»

Калінкавічы, Бешанковічы, Халопенічы, Мікашэвічы, Ганцавічы, Асіповічы, Смілавічы, Клімавічы, Карэлічы, Пухавічы.

Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ск»

Белаазёрск, Ваўкавыск, Арэхаўск, Рудзенск, Чачэрск, Лагойск, Ельск.

Геаграфічныя назвы, што заканчваюцца на «ь»

Моўчадзь, Чэрвень, Дрэтунь, Убарць, Любань, Друць, Рось.

Гарады і даты

Мінск — 1067, Гомель — 1142, Віцебск — 1021, Магілёў — 1267, Гродна — 1128, Брэст — 1019, Бабруйск — 1387, Барысаў — 1102, Орша — 1067, Пінск — 1097, Мазыр — 1155, Салігорск — 1963, Полацк — 862, Наваполацк — 1963, Старыя Дарогі — 1582.

Назвы з двух слоў

1. Буда-Кашалёва. **2.** Зялёны Бор. **3.** Чырвоная Слабада. **4.** Мар'іна Горка. **5.** Вялікая Бераставіца. **6.** Астрашыцкі Гарадок. **7.** Старыя Дарогі. **8.** Сасновы Бор. **9.** Давыд-Гарадок.

З гісторыі беларускай гаспадаркі. Падзеі і даты

1. У пачатку XVIII ст. заснаваны Радзівіламі ў Налібоках і Урэччы. **2.** У 1949 г. **3.** У 1950 г. **4.** БелДРЭС, пабудавана ў 1927—1930 гг. **5.** У 1872 г. заснавана князем Паскевічам у Добрушы. **6.** З Дашавы — Украіна, Львоўская вобласць. **7.** У 1983 г. **8.** У 1965 г. **9.** У 1984 г. **10.** Трамвай у Віцебску ў 1898 г., тралейбус — у Мінску ў 1952 г.

Галаваломкі

Лёгкая прамысловасць

1. Баранавічы. **2.** Слонім. **3.** Слуцк. **4.** Гомель. **5.** Жлобін. **6.** Мінск. **7.** Горкі. ВІЦЕБСК.

Харчовая прамысловасць

Глыбокае, Жабінка, Рагачоў, Камянец, Крупкі, Бяроза.

Машынабудаванне

1. Магілёў. **2.** «Беларусь». **3.** Бабруйск. **4.** Барысаў. **5.** Жодзіна. **6.** Гродна. **7.** Пінск. **8.** Брэст. «ГАРЫЗОНТ».

Хімічны комплекс

1. Наваполацк. **2.** Светлагорск. **3.** Магілёў. **4.** Салігорск. **5.** Гомель. **6.** Ліда. **7.** Брэст. «ПАЛІМІР».

Лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць

Бабруйск, Вілейка, Чашнікі, Хойнікі, Слонім, Масты, Пінск, Мазыр.

Транспарт

1. Калінкавічы. **2.** Баранавічы. **3.** Петрыкаў. **4.** Абухава. **5.** Магілёў. **6.** Віцебск. **7.** Стоўбцы. **8.** Мінск. **9.** Горкі. **10.** Лунінец. КАРАЛЕЎСКІ.

Па асобных мясцінах Беларусі

Віктарына «12 пытанняў па карце Беларусі»

1. Палеская. **2.** На Мінскім узвышшы, у межах Валожынскага раёна. **3.** Прыпяць. **4.** Верхнядзвінскі. **5.** У Віцебскай вобласці. **6.** У Наваполацку і Мазыры. **7.** Здабычай даламітаў. Каля Віцебска. **8.** Нёмана. **9.** Замкавая. **10.** Цэнтральнабярэзінская. **11.** Аршана-Магілёўская. **12.** Вілейскае.

Крыжаванкі «Па Беларусі»

По гарызанталі: **2.** Дуб. **5.** Талачын. **8.** Кавун. **9.** Арляк. **11.** Стоўбцы. **12.** Уюн.

По вертыкалі: **1.** Тураў. **3.** Капуста. **4.** Выдрыца. **6.** Рак. **7.** Вяз. **10.** Аўсюк.

По гарызанталі: **3.** Броды. **6.** Морач. **7.** Асаед. **8.** Бусел. **10.** Котра. **11.** Асвея.

По вертыкалі: **1.** Нарач. **2.** Выдра. **4.** Дрыса. **5.** Масты. **9.** Ласка. **10.** Клецк.

По гарызанталі: **4.** Лагойск. **7.** Гарынь. **8.** Івянец. **9.** Сава. **10.** Лань. **13.** Катран. **14.** Бобрык. **16.** Гусцяра.

По вертыкалі: **1.** Плаўна. **2.** Крот. **3.** Косава. **5.** Дрывяты. **6.** Андатра. **11.** Чавусы. **12.** Кобрын. **15.** Пціч.

Займалка «У час адпачынку»

Абсалютныя вышыні: А 1 — г. Мілідаўская на Ашмянскім узвышшы; Б 8 — вышэйшая кропка Капыльскай грады; В 2 — г. Лысая; Г 3 — вышэйшая кропка Віцебскага ўзвышша; Д 6 —

вышэйшая кропка Загароддзя; **Ж 3** — г. Замкавая; **З 7** — г. Дзяржынская (Святая).

Рэкі: А 6 — Вілія; Б 3 — Мухавец; В 1 — Свольна; В 4 — Прыпяць; В 8 — Свіслач (Дняпроўская); Д 2 — Бярэзіна (Нёманская); Д 7 — Яселъда; Е 3 — Ула; Е 5 — Котра; Е 7 — Друць; З 1 — Дрыса; З 6 — Палата.

Азёры: Б 2 — Дрывяты; Б 5 — Нарач; В 7 — Лукомскае; Е 1 — Асвейскае; Е 8 — Чырвонае; Ж 4 — Сялява.

Адміністрацыйныя раёны: А 4 — Гарадоцкі; А 7 — Аршанскі ці Ганцавіцкі; В 5 — Крычаўскі: Г 1 — Быхаўскі; Г 6 — Барысаўскі ці Івацэвіцкі; Г 8 — Жыткавіцкі; Д 4 — Столінскі; З 2 — Жабінкаўскі.

Змест

Гэта ты, мая Беларусь 4
Па блакітных прасторах 23
Раслінны і жывёльны свет 39
Паселішчы. Гаспадарка 49
Па асобных мясцінах Беларусі 61
Адказы 73

Навукова-папулярнае выданне

АДЗІНЦОЎ Сяргей Міхайлавіч
СІДОР Сяргей Іванавіч

Займальная геаграфія Беларусі

Загадчык рэдакцыі *М. А. Нікітка.* Рэдактар *Л. А. Цімафеева.* Вокладка мастака *М. М. Грыбава.* Мастацкі рэдактар *Л. А. Дашкевіч.* Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплавоцкая.* Карэктар *Т. М. Вядзернікава.*

Здадзена ў набор 20.04.92. Падпісана ў друк 03.11.94. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура Тып Таймс. Высокі друк з ФПФ. Умоўн. друк. арк. 4,2. Умоўн. фарба-адбіт. 4,41. Ул.-выд. арк. 3,84. Тыраж 18 600 экз. Заказ 1008.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.